Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 203 (5036)
ВЕРАСНЯ
11
АЎТОРАК
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

АБ ПАЛІТСЕКТАРЫ ВІННІЦКАГА АБЛЗУ

ПАСТАНОВА ЦК ВКП(б)

ЦК ВКП(б) устанаўляе, што ч.в.а. начальніка палітсектара Вінніцкага аблзу тав. КАЛТЫПІН з пачатку хлебазагатовак 1934 года заняў няправільную пазіцыю. Тав. Калтыпін не толькі не змагаўся з антыдзяржаўнымі тэндэнцыямі ў хлебазагатоўках, але і ў найбольш напружаны перыяд загатовак тармазіў ход хлебаздачы (дырэктывы палітсектара ад 13 і 30 жніўня 1934 г.).

Некаторыя начальнікі палітаддзелаў МТС, замест узмацнення тэмпаў хлебаздачы, пераключыліся пасля дырэктывы палітсектара на скіданне хлебафуражных балансаў і спынілі работу па хлебаздачы. Начальнік палітаддзела Станіслаўчыкаўскай МТС тав. Берозоўскі ўцягнуў у складанне хлебафуражнага балянса работнікаў калгасаў.

ЦК ВКП(б) пастанаўляе:

1. Абвясціць тав. Калтыпіну суровую вымову і зняць яго з пасады намесніка начальніка палітсектара Вінніцкага аблзу.

2. Абвясціць вымову начальніку палітаддзела Станіслаўчыкаўскай МТС тав. Берозоўскаму.

3. Прапанаваць палітсектару і начальнікам палітаддзелаў МТС Вінніцкай вобласці на справе выправіць дапушчаную памылку і ў найкарацейшы тэрмін поўнасцю закончыць гадавы план хлебаздачы.

9-га верасня 1934 г.

ЦК ВКП(б)

УЧОРА НА ЎРАЧЫСТЫМ ПЛЕНУМЕ МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА

Працоўныя Менска дэманстравалі сваю бязмежную адданасць справе ЛЕНІНА-СТАЛІНА, сваю гвачую любоў да непераможнай Чырвонай арміі і яе слаўнага правадыра тав. К. Е. ВАРАШЫЛАВА

ГАТОВЫ ПАЦАВАЦЬ ЗБРОЮ ПРАЦОЎНЫХ УКРАІНЫ

Учорашні дзень быў днём магутнай грандыёзнай дэманстрацыі ня гатоўнасці да новых баёў за дальнейшыя перамогі соцыялістычнага будаўніцтва, да абароны нашай цудоўнай радзімы.

Учорадбыўся парад, прысвечаны завяшэнню вучэбных заняткаў войскаў Беларускай ваеннай акругі. Парадам прымаў народны камісар абароны тав. **К. Е. ВАРАШЫЛАЎ.**

На гэты парадзе нашы слаўныя байцы, камандзіры і палітработнікі яшчэ раз паказалі, што непераможная часная Чырвоная армія — фундамент вялікай соцыялістычнай будоўлі — гатова з гонарам выканаць кожны вярхоў савецкай зямлі, гатова адказаць знішчальным ударам на кожны ўдар імперыялістычных падпальшчыкаў новай антысавецкай вайны.

Народы Савецкага Саюза, пад кіраўніцтвам нашай Леніна, пад кіраўніцтвам любімага **СТАЛІНА**, няўхільна ўмацоўваюць абароназдольнасць сваёй соцыялістычнай радзімы.

Учарашні парад яшчэ раз пераканаўча паказаў нашу нахісную рашымасць і гатоўнасць працаўніцтва соцыялістычнае будаўніцтва, грудзямі стаць за ўмацаванне справу Леніна-Сталіна.

Гэта гатоўнасць адчувалася ў магутным гуле прапелераў, у шалітных калонах байцоў, у маляўнічым маршы чырвонай конніцы. Гэта гатоўнасць адчувалася ў магутным захапляючым падйёме жнім пролетарыі, калгаснікі, працоўныя дэманстравалі сваю бязмежную адданасць справе Леніна-Сталіна, сваю волю, сваё імкненне аддаць усе сілы на будаўніцтва соцыялізма, на абарону соцыялістычнай радзімы.

Прысец тав. Варашылава, жалезнага палкаводца ўзброеных сіл краіны Савецкаў, слаўнага і выпрабаванага саратніка нашага правадыра, настаўніка і друга тав. Сталіна, выклікаў новую хвалю творчага энтузіязму.

Совецкая Беларусь адзначыла прыезд Клімэнція Ефрэмавіча вялікім заваяваннем у барацьбе за большэвіцкія калгасы, за калгасную заможнасць. Гатовы план хлебапаставак на БССР выканан поўнасцю.

Прадстаўнікі рабочага класа, прадстаўнікі калгаснікаў, выступаўшыя на парадзе, запэўнілі тав. Варашылава і праз яго ленінскі ЦК ВКП(б) і совецкі ўрад, што мы не супакоімся на дасягнутых поспехах, што мы пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б на чале з тав. **ГІКАЛО** прыложым усе сілы, удесяцярым сваю энергію, каб з гонарам завяршыць увесь сельска-гаспадарчы год, каб выканаць і перавыканаць промфінплан. Іх вуснамі гаварылі мільёны ўсіх пролетарыяў, усіх працоўных Совецкай Беларусі.

І мы павінны з гонарам стрымаць слова, данае тав. Варашылаву, мы можам і павінны працаваць яшчэ лепш, мы павінны дабіцца таго, каб хутчэй і з поўным поспехам выканаць усе абавязацельствы перад дзяржавай, завяршыць усе сельска-гаспадарчыя работы гэтага года, дабіцца, каб кожны завод і кожная фабрыка, кожны ўчастак транспарта выканалі пастаўленыя перад імі задачы.

Совецкая Беларусь — неадзялімая частка ўсяго СССР. Нашы поспехі — вынік мудрага ленінскага кіраўніцтва ЦК ВКП(б) і асабіста тав. **СТАЛІНА,** нашы поспехі дасягнуты пры дапамозе пролетарыяў усяго СССР. Будзем-жа працаваць яшчэ лепш, аддамо ўсе свае сілы на тое, каб перадавы фарпост СССР на рубяжы з капіталістычным Захадам — Совецкая Беларусь была ў перадавых радах у вялікай брацкай сямі народаў краіны Совецкаў, каб мы маглі потым з гонарам сказаць, што сваё слова, данае Клімэнцію Ефрэмавічу Варашылаву, мы стрымалі.

НА ТРЫБУНЕ ПЛЕНУМА ГАРСОВЕТА: ТТ.: ВАРАШЫЛАЎ, БУДЗЕННЫ, ГІКАЛО, ВАЛКОВІЧ, ГАЛАДЗЕД, УБАРЭВІЧ, БЕНЕК І ІНШ.

На свяце магутнасці

Члены совета чырвонай сталіцы БССР—Менска занялі месца з правага боку імправізаванай абітай чырвонай матэрыяй урадавай трыбуны. Злева—трыбуна італьянскай ваеннай дэлегацыі.

Супроць трыбун усё шчыльней і шчыльней плошча запаўняецца рабочымі, работніцамі, калгаснікамі і калгаснікамі Менска і Менскага раёна, якія прышлі сюды перадаць сваё шчырае прывітанне слаўнай непераможнай Чырвонай арміі і яе арганізатару і геніяльнаму палкаводцу, любімаму наркому Клімэнцію Ефрэмавічу Варашылаву. Войскі выстраены для параду.

Тры гадзіны дня. Па ўсіх шырокіх шосторах раздаецца магутнае «ура». Усе галовы паварочваюцца насустрэ любімаму наркому.

У суправаджэнні т. **Будзённага** і камандуючага Беларускай ваеннай акругі т. **Убарэвіча,** т. **Варашылаў** галопам аязджае ваенныя часці і калоны працоўных г. Менску, пасля чаго пад'язджае да месца пленума і хутка ўзыходзіць на трыбуну. Гучнае «ура» і выгукі—«Няхай жыве тавары Варашылаў!»—пабываллай хвалі праносяцца ва ўсіх калонах.

Сумесна з тав. Варашылавым на трыбуну ўзыходзяць тт. **Гікало, Убарэвіч, Валковіч, Галадзед, Смірноў, Эйдэман, Будзённы, Закоўскі, Бенек, Кавальчук, Рыскін, Конік, Горын, Чарнушэвіч** і інш.

— Я вельмі гаруся тым, што маю магчымасць перадаць ад імя ЦК КП(б)Б, урада БССР і ўсіх працоўных Беларусі большэвіцкае прывітанне нашай слаўнай Чырвонай арміі і любімаму наркому Клімэнцію Ефрэмавічу Варашылаву, —разносяцца кінутыя ў мікрафон словы старшыні СНК БССР тав. **Галадзеда.**

Прыезд тав. Варашылава працоўныя Беларусі адзначылі ператэрміновым выкананнем плана хлебапаставак, чырвонамі абозамі і пасяховым выкананнем другіх гаспадарча-палітычных кампаній. Яго прыезд працоўныя Беларусі адзначаюць яшчэ большым узмацненнем абароназдольнасці краіны, яшчэ большым узмацненнем барацьбы за перамогу на ўсіх франтах соцыялістычнага будаўніцтва.

— Няхай жыве геніяльнейшы правадыр працоўных і арганізатар Чырвонай арміі тав. **Сталін!**

Няхай жыве вялікі палкаводец нашай слаўнай непераможнай Чырвонай арміі тав. **Варашылаў!**

З прывітаннем ад імя рабочых пролетарскай сталіцы выступіў рабочы машына-будаўнічага завода імя Варашылава тав. **Міньковіч,** які просіць таварыша Варашылава запэўніць ЦК ВКП(б) і асабліва тав. Сталіна ў тым, што працоўныя Менска, як і ўсёй Беларусі, будуць і ў далейшым, не шкадуючы сіл і энергіі, змагацца за ажыццяўленне задач соцыялістычнага будаўніцтва, за далейшае ўмацаванне абароназдольнасці краіны.

З прывітаннем ад калгаснікаў БССР выступіў тав. **Карнейчык,** ад піянераў тав. Варашылава вітаў тав. **Блувштэйн.**

Да мікрафона падыходзіць тав. Варашылаў. Воплескі і крыкі «ура», то змаўкаючыя, то нарастаючыя з яшчэ большай сілай, доўга не даюць яму гаварыць.

— Таварышы калгаснікі і калгасніцы, рабочыя і работніцы, комсамольцы і піянеры, чырвонаармейцы, камандзіры і палітработнікі, я рад вітаць вас ад імя ЦК ВКП(б) і ўрада Совецкага Саюза.

— Рабоча-сялянская Чырвоная армія цяпер праводзіць праверку сваёй баявой падрыхтоўкі. Войскі Беларускай ваеннай акругі на так тычных занятках, якія зараз закончыліся, паказалі добрыя рэзультаты.

Нашы чырвонаармейцы, камандзіры і палітработнікі, разам з працоўнымі Совецкай Беларусі дабіліся вялікіх поспехаў на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва. У часе заняткаў яны яшчэ раз пераканаліся, з якім энтузіязмам і энергіяй калгаснікі і рабочыя Беларусі змагаліся за тое, каб не адстаць ад Чырвонай арміі ў выкананні стаячых перад імі задач. І гэта зразумела. Мы разумеем армія, не аддзяляем ад разумення народ. Мы —адзіны цэлы калектыў, які паставіў перад сабой сусветную задачу—пабудову соцыялізма і за ажыццяўленне гэтай задачы змагацца.

— Гэта задача складаная і цяжкая, але мы яе вырашым.

— Таварышы працоўныя БССР! Я буду шчасліў перадаць ЦК ВКП(б) і ўраду Саюза, перадаць тав. **Сталіну,** што вы не толькі абяцаеце працаваць пабольшэвіцку, але і змагаецеся за тое, каб гэтае абяцанне на справе выканаць.

Няхай жыве наш вялікі Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

Няхай жывуць пролетарыі нашай краіны, нашы калгаснікі і ўсе працоўныя!

Няхай жыве наша Чырвоная армія!

Няхай жыве наша магутная комуністычная партыя і яе мудры, вялікі правадыр таварыш Сталін!

Апошнія словы тав. Варашылава тонуць у грамавых крыках «ура», якія з вялікай сілай праносяцца хваляй па калонах ваенных часцей і працоўных горада Менска.

Урачысты пленум горсовета пад бурныя воплескі і крыкі «ура» паслаў прывітанні тав. Сталіну і тав. Варашылаву.

Пятрусь Броўка

КЛІМЕНТ ЕФРЭМАВІЧ

Нагу паставім ў стрэмя мы —
вятрамі не дагнаць...
Скажы, Клімент Ефрэмавіч, —
мы сядзем на каня.

Душою так гарэлі мы,
каб першым быў завод,
Скажы, Клімент Ефрэмавіч, —
і ў бойцы — кулямёт!

Мы адкідаем стому,
калі ідзем ў галоп.
Ты сябра наш вядомы
у бурны Перакоп.

Дзяды хадзілі з горам
сабе шукацы крыжы —
З фельдмаршалам Суворавым,
мяркую каб жыць.

А мы—начорта гэта нам!
Мы самі пераможам,
Мы самі сабе гетманы —
і рукі ў нас, і розум.

І тут не скажаш вершам, —
а хто сягоння пешы?
І я ліцейшчык першы
і кулямётчык першы.

А ёсць яшчэ агністых,
вазьмі ды толькі выстрай:
з калгасаў трактарыстаў,
надзейных матарыстаў.

***

Нашай сілы нім улічаны
буйны шквал?
Прагуляўся пад Царыцыным
адмірал.

Ён прашоў тады рабоўнікам,
а што ўзяў?
Дзе твае цяпер палкоўнікі,
адмірал?

Не адбег ад кулі наскае
на вакзал.
Пагубляў пелеты царскія
адмірал.

Сваіх коней перагрэлі мы
ставіць кон.
Ты нас вёў, Клімент Ефрэмавіч,
на агонь.

І таму што секлі густа іх —
клалі ў рад,
прыпылі вятры індустрыі
ў Сталінград.

———

І зноў, як толькі стрэлямі
граніцы зазвіняць,
Скажы, Клімент Ефрэмавіч,
мы сядзем на каня.

Мы пройдзем межы свету
праз хвалі і агні,
Каб біўся пульс Совецкаў
спакойна ў комунізм.

Парад баявой гатоўнасці

Дрыжыць зямля ад магутных крыкаў «ура» ў гонар жалезнага наркома Клімэнція Ефрэмавіча.

З края ў край велізарнай плошчы грыміць гул прывітанняў у славу непахіснай ленінскай партыі, стварыўшай і выпеставаўшай пад кіраўніцтвам сталёвага **Сталіна** рабоча-сялянскую Чырвоную армію — гэты непераможны аплот соцыялізма.

Апошнія словы наркома абароны тонуць у гуках «Інтэрнацыянала» аркестраў усіх часцей, якія прымаюць удзел у парадзе.

Пачынаецца ваенны парад войск.

З вінтоўкамі на перавес у металічных касках праходзяць байцы Н-скай пяхотнай дывізіі. Куды дзелася стома ў выніку многіх дзён, праведзеных на толькі ўчора закончыўшыхся тэхнічных заняткаў. Роўны строй, не дрогнуць вінтоўкі. Пяхота паказвае высокі клас маршавай падрыхтоўкі.

— О-го-го! — чуваць у радах дзесяткаў тысяч працоўных Менска, што прышлі сёння на плошчу, каб разам з Клімэнціем Ефрэмавічам даць адэпку пройдзенаму часцямі Беларускай ваеннай акругі вучэбнаму году пад кіраўніцтвам свайго камандуючага тав. **Убарэвіча** і члена рэўваенсовета тав. **Смірнова.**

— Ай, ідуць, ідуць!

Вось ідуць пяхотныя часці з вінтоўкамі на плечах. Якая дысцыплінаванасць у радах! Магутным «ура» вітаюць яны свайго любімага наркома. Магутным шквалам адабрэння адказваюць ім калоны дэманстрантаў за дысцыплінаванасць і пасяховую вучобу.

Кароткі інтэрвал. Перад трыбунай праходзіць артылерыя. Лёгкая, цяжкая, на конях і машынах, выклікаючая агульнае адабрэнне і захапленне.

Недзе далёка чуецца слабы гул. Ён нарастае з кожнай секундай і вось адна за другой высока на далёкім небасхіле паказваюцца сотні птушак, адразу адзіўляючыя сваім вялікім размерам.

Велізарнейшае напружанне прарвалася ў буры захаплення і радасці, калі гэтыя дзівосныя птушкі сталі выразнымі самалётамі—бліскучымі, сталёвымі птушкамі, напоўненымі навестра магутным рокатам сваіх шматлікіх маторaў.

Дзесяткі тысяч пар вачэй, не адрываючыся, прыкаваны к небу. Упераце самалёты, на якіх совецкія лётчыкі паказалі дзівосныя ўзоры ў Арктыцы. За імі яшчэ і яшчэ, яшчэ і яшчэ, якіх радасна вітае шматтысячная аўдыторыя, выказваючая сваё захапленне чырвонай авіяцыяй, аўладаўшай высокай лётнай тэхнікай.

А ўнізе ўсё ідзе і ідзе артылерыя, удасканаленыя тачанкі, выклікаючыя радаснае здзіўленне старых будзёнаўцаў, зноў радыёчасці.

Правым плячом уперад знімаецца з поля аркестр штаба войск Беларускай акругі, які ўжо больш гадзіны граў тушы і маршы праходзіўшым часцям. Яго месца заняў аркестр Н-скага кавалерыйскага корпуса. Праносяцца міма трыбуны ліхія кавалерыйскія часці, зноў тачанкі, кулямёты.

Не паспела кавалерыя ачысціць аэрадром, як усё мацней і мацней чуен рокат. На плошчы **на чале з сынам легендарнага Шаумяна** ўступаюць новыя атрады—паказальнік непераможнай індустрыяльнай магутнасці Саюза Совецкаў, гіганцкага росту тэхнічна аснашчонай арміі.

Часць за часцю, захоўваючы строй, праходзяць міма трыбуны, вітаючы свайго наркома — любімага Кліма Варашылава.

Ужо звыш двух гадзін як ідзе парад, а яму ўсё канца не відаць. Радасцю напаўняюцца дзесяткі тысяч прысутных пры прахаджэнні гэтых верных вартаўнікоў пашага мірнага будаўніцтва.

Захапляючая карціна! Дзівосная панарама!

Ва ўсіх адно пачуццё, усе ахоплены адным парывам, ва ўсіх адна думка: з такой тэхнікай наша армія, нашы цудоўныя байцы непераможны. З такой арміяй нам не страшны ніякія варожыя падкопы.

Гэта быў не парад, гэта была дэманстрацыя поспехаў соцыялістычнага будаўніцтва, дэманстрацыя барацьбы за другую пяцігодку, за справу сусветнага пролетарыята на адным з адказнейшых яго ўчасткаў — на ўчастку абароны межаў першай у свеце соцыялістычнай радзімы.

МЕНСК У ГЭТЫ ДЗЕНЬ

З самае раніцы пачаўся гэты надзвычай радасны дзень. Сталіца БССР, упрыгожаная па-святочнаму—сцягамі, прывітальнымі лозунгамі, зеленню—рыхтавалася да сустрэчы часцей Чырвонай арміі, якія вярталіся з тактычных заняткаў, і яе правадыра—жалезнага наркома абароны Клімэнція Ефрэмавіча Варашылава.

Ля фабрык і заводаў, ля начальных устаноў і прадпрыемстваў збіраліся рабочыя, студэнты, вучні, служачыя, каб потым бясконцым, магутным струменем калонны рушыцца да месца парада.

Ішлі сталінцы, варашылаўцы, молатаўцы, чыгуначнікі, швейнікі... Ішоў увесь працоўны Менск. У першых радах—знатныя людзі нашай краіны—лепшыя ударнікі, героі пяцігодкі.

Вуліцы напоўнены весёлым, радасным гулам, гучнымі спевамі, маршамі аркестраў. Шмат кветак... Розніжаляровая завеса транспарантаў, плакатаў, лозунгаў, партретаў правадыроў. Вылучаюцца плакаты з надпісамі:

— Няхай жыве родная Чырвоная армія—наша любоў і наша гордасць.

— Мы стаім за мір і адстойваем справу міру. Але мы не баімся пагроз і гатовы адказаць ударам на ўдар падпальшчыкаў вайны (Сталін).

Па шматлікіх трактах доўгай істужкай цягнуцца да горада бясконцыя калгасныя чырвоныя абозы. Тысячамі фурманак з бульбай, гародзінай, фруктамі адзначыла калгасная Меншчына гэты выдатны дзень. Наперадзе чырвоных абозаў—пяць калгаснікаў верхам на конях. Гэта яны ў спаборніцтве з другімі калгаснікамі заваявалі гэты гонар прымаць парад Чырвонай арміі разам з любімым Клімам.

Калгасныя дэлегацыі ўключыліся ў агульны струмень пролетарскіх калон.

Якое цудоўнае відовішча!

Гэта была дэманстрацыя радасці пролетарыяў за сваю радзіму, якая здолела стварыць такую магутную Чырвоную армію, акружаную гарачай любоўю ўсяго народу.

Дзесяткі тысяч працоўных дэманстравалі сваю беззаветную адданасць ленінскай партыі, яе мудраму правадыру вялікаму Сталіну і яго блізкэйшаму саратніку—магутнаму чырвонаму палкаводцу Кліму Варашылаву.

Пролетарыі Менска мелі магчымасць убачыць велізарны рост баявой магутнасці ўзброеных сіл дыктатуры пролетарыята—Рабоча-сялянскай Чырвонай арміі. Магутная дэманстрацыя чырвонаармейскіх часцей па зямлі і ў паветры —навейшай ваеннай тэхнікі—велізарнай арміі нашай совецкай артылерыі, нашых совецкіх танкаў, нашай совецкай авіяцыі ўяўляла сабой яркую ілюстрацыю слоў тав. Варашылава аб гатоўнасці Чырвонай арміі абараняць соцыялістычную радзіму ад магчымага нападу імперыялістычных драпежнікаў.

Няма такой сілы, якая магла-б аламіць вялікую радзіму пролетарыяў усіх краін, завяваваную кроўю рабочых і сялян. Яркім полымем гарыць над нашай краінай пяцікутная зорка, якая прыцягвае да сябе позіркі працоўных і прыгнечаных усяго света.

Сонца блізілася да захаду, калі апошнія калоны са спевамі і музыкай варочаліся ў горад.

ВЫШЭЙ МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКУЮ ВУЧОБУ У КОМСАМОЛЕ!

З прамовы загадчыка аддзелам культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б тав. Д. КОНІКА на ўсебеларускай комсамольскай нарадзе па пытаннях палітвучобы

Выніні работы ў гэтым годзе ў галіне партпалітасветы як па лініі ўсёй нашай партыі, так і па лініі комсамола, велізарныя.

Гэтыя дасягненні з'яўляюцца рэзультатам таго, што наша партыя і яе правадыр тав. Сталін ва ўсю шырыню паставілі пытанні ўзмацнення ідэйнага ўзброєння членаў партыі і комсамола, ідэйнай узброенасці кожнага.

Рашэнні XVII з'езда нашай партыі, даклад таварыша Сталіна—дакументы найвялікшага гістарычнага значэння—далі велізарнейшы штурмак усёй нашай партыі, усяму рабочаму класу, калгасному селяніну і нашай моладзі да мыбокага ўсвоєння марксісцка-ленінскага вучэння.

Сучасны этап нашага соцыялістычнага росту, як ніколі, прад'яўляе вялікія патрабаванні да аўладання марксісцка-ленінскай вучобы. «Паход рэвалюцыйнай моладзі — вось што нам трэба, таварышы.» (Сталін). І трэба ў гэты паход рушыць каб мы моцна вывучалі не палітыку, але і агульна-адукацыйныя навукі: матэматыку, фізіку, гісторыю, літаратуру, графію і замежныя мовы. Комсамол, які з'яўляецца авангардам моладзі, павінен не толькі правесці ударка, але і вучыцца на ударніка».

Трэба ўлічваць тую акалічнасць, што растромзены намі класавы вораг не дабіт. Класавая барацьба прадаўжаецца. Класавы вораг усякімі хітрыкамі, ашуканствам, замаскавана, «ціхай сапай», выкарыстоўваючы любую слабасць работнікаў і асабліва недахоп рэвалюцыйнай пільнасці, імкнецца сарваць нашу работу. Вось яшчэ чаму комсамолец павінен быць ва ўсебаяўленні ў галіне аўладання марксісцка-ленінскім вучэннем.

«Трэба вучыцца, вучыцца і вучыцца». Гэты лозунг тав. Леніна стаіць перад усімі намі і зараз ва ўсю шырыню. Розніца толькі ў тым, што зараз вучоба больш складаная, чым у 1920 г., калі тав. Ленін з трыбуны III з'езда РКСМ кінуў гэты лозунг. Ужо тады т. Ленін паставіў перад комсамолам задачу — вучыцца так, каб асвоіць, крытычна пераапрацаваць і вывучыць усю спадчыну мінулага. Ужо тады тав. Ленін ва ўсю шырыню паставіў пытанне аб агульна-адукацыйнай вучобе. Пытанне спалучэння марксісцка-ленінскай вучобы з дакладным вывучэннем гісторыі, геаграфіі і наогул агульна-адукацыйных прадметаў,—гэта пытанне ставіцца перад вамі ва ўсю шырыню.

Тав. Кагановіч у сваім дакладзе на XVII з'ездзе ВКП(б) сказаў: «Мы праводзім зараз агрэмінімум, тэхмінімум. Нам трэба дабіцца, каб быў партпалітмінімум і каб не было ні аднаго члена партыі, які не аўладаў асновамі марксізма-ленінізма».

Сказанае палкам адносіцца і да вас, комсамольцаў. Трэба дабіцца, таварышы, таго, каб не было ні аднаго комсамольца, не аўладаўшага вучэннем Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна.

ДОБРА АРГАНІЗУЕМ ВУЧОБУ, ПАЛЕПШЫМ КІРАЎНІЦТВА ЁЮ

Як на ўсіх участках нашай шматгранай работы, так і на гэтым важнейшым участку падрыхтоўкі і арганізацыя справы рашаюць усё. Калі мы добра арганізуем вучобу, тады мы ўнікнем скажэнняў у вучобе, якія вельмі шкодна адбіваюцца на тых, каго мы вучым. На гэты скажэнні ўказаў ЦК ВКП(б) сваім спецыяльным рашэннем ад 22 красавіка 1934 г. Скажэнні гэтыя праяўляліся ў такіх недарэчных формах, як «палітбаі», «палітаблавы», «палітдудачкі» і т. д.

Найпярэдзіць паўтарэнне гэтых скажэнняў у наступаючым навучальным годзе мы павінны, па-першае, добрам у школы строга на ўзроўню развіцця слухача; па-другое, адборам лепшых прапагандыстаў папярэдняй праверкай іх; па-трэцяе, садзейнасцю прапагандыстам у тэарытычнай вучобе; па-чацвертае, штодзённым аператыўным кіраўніцтвам справай марксісцка-ленінскага выхавання саміх сакратароў і членаў бюро комсамольскіх камітэтаў; па-пятае, максімальнай увагай партыйных арганізацый да справы вучобы ў комсамоле. ЦК КП(б)Б на прыкладу ЦК КП(б)У замацуе зараз мерапрымствы па дапамозе комсамолу ў пастаноўцы марксісцка-ленінскай вучобы сярод комсамольцаў.

Гэтыя мерапрымствы выкліканы тым, што сям-там на месцах маюць месца такія два з'явішчы.

Першае — партыйныя арганізацыі вельмі часта недаўлічваюць тае, што велізарнейшых задач марксісцка-ленінскай вучобы ў комсамоле сам комсамол, без штодзённай увагі, пастаяннай дапамогі і кіраўніцтва партыйнай арганізацыі, вырашыць не зможа.

Другое — партыйныя арганізацыі не аказваюць неабходнай дапамогі комсамолу ў падборы прапагандыстаў, не ўваходзяць у змест комсамольскай палітасветы, своечасова не рэагуюць і не ўскрываюць асобных скажэнняў і памылак у пастаноўцы прапагандысцкай работы ў комсамольскіх арганізацыях.

Ясна, што гэта нецярпіма. А таму распрацаваныя ЦК КП(б)Б мерапрыемствы прапануюць партарганізацыям прыняць канкрэтныя меры, забяспечваючыя паляпшэнне марксісцка-ленінскай вучобы ў комсамоле, павышэнне не ідэйна-тэарытычнага ўзроўню.

Пытанні якасці вучобы, пытанні ўзняцця тэарытычнага ўзроўню ў адпаведнасці з патрабаваннямі XVII з'езда ВКП(б) патрабуюць узмацнення партыйнага кіраўніцтва і прад'яўляюць нам зусім канкрэтныя патрабаванні да якасці работнікаў, занятых гэтай справай.

Неабходна дабіцца таго, каб сакратары і члены бюро комсамольскіх камітэтаў самі непасрэдна ўваходзілі ў дэталі арганізацыі палітычнай вучобы, наведвалі палітшколы, займаліся іх работай, вывучалі якасць выкладання, вывучалі-бы прапагандысцкія кадры, прыслухоўваліся да запатрабаванняў прапагандыстаў, іх скаргаў, дапамагалі-бы прапагандыстам у іх рабоце, вывучалі склад слухачоў палітшкол і т. д.

АБ ПАРТГАБІНЕТАХ, ПРАПАГАНДЫСЦЕ І СЛУХАЧУ

Важнейшае месца ў сістэме марксісцка-ленінскага выхавання павінны заняць партгабінеты, якія ёсць кожным раёне, і дамы партактыва.

Бяда нашых партгабінетаў у тым, што яны пакуль не выходзяць за дамкі дзейнасці бібліятэчкі, куды можна прыйсці і атрымаць кнігу. А між тым партгабінет павінен быць месцам канцэнтрацыі сіх партыйных сіл для справы ленінскай арганізацыі ідэйна-палітычнай работы. Гэта асноўнае. Калі па кожнаму пытанню партгабінеты праяўлялі сваю актыўнасць у арганізацыі і канцэнтрацыі неабходных для прапагандыстаў мясцовых матэрыялаў, у падборы літаратуры, у запрашэнні для гутарак з прапагандыстамі кіруючага актыва, яны рабілі-б удзячнейшую справу. На жаль, гэтага яны яшчэ не робяць. Не займаюцца гэтым і дамы партактыва.

Хіба не зразумела, што такімі адносінамі да гэтай справы партгабінеты і дамы партактыва праяўляюць сваё нежаданне ўсямерна дапамагаць прапагандысту. Зразумела, што па гэтаму нежаданню трэба ўдарыць і рашуча дапамагчы перабудаваць іх работу.

Цэнтральнае месца ў вядзенні марксісцка-ленінскага выхавання займае прапагандыст. Нам неабходна павялічыць у комсамоле колькасць такіх прапагандыстаў, якія ўмеюць добра арганізаваць работу палітгуртка, якія ўмеюць аўладаць аўдыторыяй, падыйсці да яе як належыць, зацікавіць яе, умела пабудаваць заняткі.

Для таго, каб мець добрых прапагандыстаў, трэба добра арганізаваць работу прапагандысцкіх семінараў, якія з'яўляюцца асноўнай формай падрыхтоўкі прапагандыстаў да заняткаў. Семінарамі трэба ахапіць усіх без выключэння прапагандыстаў комсамольскіх палітшкол як членаў партыі, так і комсамольцаў, дабіўшыся, каб семінары збіраліся ў пэўна ўстаноўленыя дні і захоўвалася строгая дысцыпліна ў арганізацыі работы семінараў.

Трэба ў першую чаргу максімальна ўзняць якасць вучобы курсаў і школ, праз якія мы рыхтавалі прапагандыстаў.

Няграматны прапагандыст мала таго, што ён блытае, але ён сваю блытаніну часамі выдае перад непадрыхтаванымі слухачамі за пункт гледжання партыі і апрача шкоды ідэйна-палітычнай рабоце нічога не дае.

Вось вам адзін з прыкладаў.

«Прапагандыст» Біруковў (Рэчыца) на занятках даказваў слухачам (рабочым запалкавага камбіната), што поўнага социялістычнага грамадства ў другой пяцігодцы мы яшчэ не пабудуем.

— Чаму? — запытваюць яго.

— Таму, — адказвае ён, — што ў другой пяцігодцы мы яшчэ не вырашым мясной праблемы. А што гэта за социялізм будзе, калі патрэбны людзей у мясе не будуць задаволены.

Вось яшчэ адзін прыклад:

Прапагандыст Ганчараў (загадчык вучэбнай часткай Барысаўскага педтэхнікума) задае слухачам пытанне:

— Якія рэкамендацыі патрэбны для паступлення ў партыю?

Слухачы па-рознаму адказваюць. Ганчараў папраўляе іх так:

— Для 3-й катэгорыі патрэбна рэкамендацыя МТС.

Зразумела, нельга ставіць знак роўнасці паміж гэтымі двума няправільна адказаўшымі прапагандыстамі. Аднак і ў першым і ў другім адказе адналькавае палітычнае невуцтва, якое рашуча трэба вытнаць з практыкі нашай вучобы.

Важнае месца ў сістэме марксісцка-ленінскага выхавання займае слухач. Каб больш даць таму, каго мы прыцягваем да вучобы, для гэтага трэба пасадзіць яго ў школу, гурток адпаведна ўзроўню яго падрыхтоўкі і развіцця. Трэба сказаць, што ў нас у галіне вучобы няўмелы падбор складу слухачоў часта прыводзіць нават да развалу гуртка, да уцечкі з школы, да зрыву прапрацоўкі праграмы, да таптання на месцы.

Што трэба для таго, каб папярэдзіць такія вынікі?

Патрэбна праверка ведаў таварышоў пры камплектаванні школ. Праверка не павінна насіць характар экзаменаў, але яна павінна быць у той-жа час праверкай падрыхтоўкі і ўзроўню развіцця прымаемага ў тую або іншую ступень партыйнай або комсамольскай школы. Праверку ведаў трэба праводзіць і ў сярэдзіне навучальнага года.

Чым хутчэй мы ўзнімем вучобу комсамольцаў, тым лепш, бо ў нас яшчэ многа палітычна-няграматных комсамольцаў.

Вось некалькі фактаў, якія сведчаць аб гэтым:

Першы: Арпоў — комсамолец запалкавай фабрыкі (Рэчыца) на пытанне аб тым, якая розніца паміж арцеллю і комунай, адказаў: «У комуне думкі ва ўсіх аднолькавыя, а ў арцелі — не».

На пытанне, якая форма калгаса на сучасным этапе з'яўляецца асноўнай, ён адказаў — «комуна».

Другі: Судакоў — комсамолец (Уначы) пры прапрацоўцы пытанняў міжнароднага становішча заявіў: «XII пленум ВККІ даў дырэктыву компартыям абавязкова зрабіць к 20-й гадавіне Окцябра пролетарскую рэвалюцыю ва ўсім свеце».

Прыведзеныя факты сведчаць аб абураючай няграматнасці, якая вельмі і вельмі шкодна. Факты гэтыя гавораць аб нездавальняючай прапрацоўцы сям-там рашэнняў нашай партыі. Асобныя арганізацыі зусім нездавальняюча кіруюць партвучобай.

Вось прыклад. У Смалявічах правялі палітбой і палічылі прапрацоўку XVII з'езда праведзенай. Прысланую ім літаратуру—даклад тав. Сталіна—звярнулі назад з такім адказам: «Даклад прапрацавалі, літаратура непатрэбна».

Хіба гэта не ўзор бюракратычнага і кампадурскага падыходу да прапрацоўкі даклада т. Сталіна?

Зразумела, таварышы, што пры падобных адносінах да прапрацоўкі партыйных дакументаў нічога, апрача канфузу, не выйдзе.

ВУЧЫЦЦА Ў КЛАСІКАЎ МАРКСІЗМА

Тав. Сталін на XVII з'ездзе ВКП(б) у галіне ідэйна-палітычнай работы высунуў наступныя задачы:

«1) Падняць тэарытычны ўзровень партыі на належную вышыню, 2) узмацніць ідэалагічную работу ва ўсіх звеннях партыі, 3) весці нястомную прапаганду ленінізма ў радах партыі, 4) выхоўваць партарганізацыі і акружаючых іх беспартыйных актыў у духу ленінскага інтэрнацыяналізма, 5) не замазваць, а крытыкаваць смела адхіленні некаторых таварышоў ад марксізма-ленінізма, 6) сістэматычна выкрываць ідэалогію і астаткі ідэалогіі варожых ленінізму плыней».

Задачы гэтыя вызначаюць увесь змест нашай работы, якую мы павінны праводзіць у галіне марксісцка-ленінскага выхавання. Апошняе павінна быць непарыўна звязана з агульнай штодзённай практычнай работай і партыйных, і комсамольскіх арганізацый.

Трэба яшчэ раз, паўтараю, добра арганізаваць вучобу. Але «школьная вучоба, — гаворыць т. Кагановіч,— павінна злучацца з палітыкай і практычнай штодзённай барацьбы». Комсамольца, таксама, як і большэвіка, трэба ўзбройваць і ў школе, і на сходзе. Партыйныя і комсамольскія сходы — гэта таксама школа, якая многаму вучыць. Усю вашу вучобу мы павінны прывязаць асноўнымі пытаннямі інтэрнацыянальнага выхавання мас.

Ахапіць кожнага комсамольца вучобай і добра вучыць яго — гэта значыць добра ведаць кожнага члена комсамола, ведаць комсамольца ў цэху, на вытворчасці, у калгасе, ведаць яго на партыйным і комсамольскім сходзе. Але і гэтага недастаткова. Трэба яшчэ ведаць комсамольца дома, на адпачынку, трэба ведаць кнігу, якую чытае гэты комсамолец. Ахапіць комсамольца вучобай — гэта значыць не толькі ахапіць яго гуртком, школай, але і прывучыць чытаць кнігі — і палітычныя, і мастацкія.

Наша мастацкая літаратура мае велізарныя дасягненні, якія былі адзначаны на першым Усесаюзным з'ездзе пісьменнікаў.

Мы можам праз мастацкую літаратуру вывучаць нашу сапраўднасць. Наша мастацкая літаратура павінна стаць неадлучнай часткай усёй нашай работы па марксісцка-ленінскаму выхаванню. Трэба чытаць мастацкія творы, дасканала іх прадумваць і прапрацоўваць.

Узяць беларускую совецкую літаратуру. Яна мае такія творы, як «Дрыгва» Коласа, «На чырвоных пядах» Лынькова, «Тэорыя Капенбрун» Самуйленка, «Шчаслівая дарога» Александровіча, «Бацькаўшчына» Кузьмы Чорнага», «Язэп Крушынскі» Бядулі, «Так пачыналася маладосць» Броўкі і інш.

Вось гэтыя названыя творы, калі вы іх уважліва прачытаеце, пачынаючы з «Дрыгвы» Коласа, якая дае яркія ўзоры класавай барацьбы на Палессі, калі вы прачытаеце Лынькова, які паказвае дарэволюцыйную барацьбу, рост і расстаноўку класавых сіл у дарэволюцыйнай Беларусі і т. д., калі вы возьмеце «Над ракой Арэсай» Купалы і цэлы рад твораў іншых пісьменнікаў, то атрымаеце рад яркіх узораў рэвалюцыйнай барацьбы і социялістычнага будаўніцтва ў Беларусі.

Чытаць трэба мастацкую літаратуру ўсяго нашага вялікага Совецкага Саюза, чытаць трэба класікаў мастацкай літаратуры, перакладную літаратуру замежных пролетарскіх пісьменнікаў. Чытаць мастацкія творы ў дадатак да прапрацоўваемых твораў Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна, у дадатак да прапрацоўваемых у школе і гуртку падручнікаў, абавязкова і неабходна. Чытаць і перачытваць трэба мастацкія творы нашага вялікага пролетарскага пісьменніка А. М. Горкага.

Нашы класікі марксізма паказваюць узор таго, як трэба адносіцца да мастацкай літаратуры — гэтай вялікай крыніцы пазнанняў.

У сваіх успамінах аб Марксе Поль Лафарг расказвае, што Маркс ведаў напамяць Гейне і Гетэ і часта цытаваў іх у размовах. Маркс наогул вельмі цаніў паэзію, чытаў Эсхіла ў арыгінале і лічыў яго і Шэкспіра двума найвялікшымі драматычнымі геніямі, якіх толькі нарадзіла чалавецтва. Шэкспіра, якога ён паважаў бязмежна, Маркс арабіў прадметам самага дакладнага вывучэння і ведаў самых нязначных дзейных асоб чго драм.

Бліскучае знаёмства з класікамі мастацкай літаратуры ў вялікай меры спрыяла выпрацоўцы той яснасці і выразнасці, якой адрозніваліся мовы Леніна, адрозніваецца мова т. Сталіна. Нашым прапагандыстам, нашым комсамольцам трэба вучыцца гэтай класічнай прастаце, выразнасці і папулярнасці мовы т. Сталіна, адточанасці фармулёвак, трапнасці параўнанняў, жывой і всебразнай форме выкладання, якія так характэрны для вялікага правадыра партыі пролетарыята.

Сістэматычнае, крапатлівае вывучэнне скарбніцы мастацкай літаратуры — абавязак кожнага прапагандыста, кожнага комсамольца, жадаючага ўзняцца на вышэйшую ідэйна-палітычную ступень. Гэту-ж цікавасць да мастацкай літаратуры, навыкі рэгулярнага чытання павінен прывіваць прапагандыст і сваім слухачам. Мастацкая літаратура павінна паслужыць сур'ёзным дадатковым сродкам фармавання комуністычнага светапогляду мас.

Я канчаю, таварышы, з упэўненасцю, што калі вы сапраўды пабольшэвіцку возьмецеся за марксісцка-ленінскую вучобу, то гэты ўчастак работы мы паднімем на такую вышыню, на якой ён павінен быць. Гэта адна з умоў таго, каб комсамольцы і комсамолкі былі «дастойнымі сынамі і дачкамі нашай маткі — Усесаюзнай Комуністычнай Партыі» (Сталін).

Вышэй марксісцка-ленінскую вучобу ў комсамоле! (Бурныя апладысменты).

ПІСЬМЫ рабочых калгаснику

САКРАТАРУ КРУПСКАГА РК КП(б)Б тав. МЯСНІКЕВІЧУ

ЗА ВЫКРЫЦЦЁ ЗЛОДЗЕЯЎ МЯНЕ ЗНЯЛІ З РАТЫ

(ПІСЬМО КАЛГАСНІЦЫ)

З 1930 года я працую ў калгасе «Пролетарская перамога», Слабодскага сельсовета (Крупскі раён). Я ўвесь час з'яўляюся членам праўлення калгаса і сельсовета. За ўдарную работу некалькі раз праміравана.

Увесь час я выкрывала злодзеяў калгаснага дабра. Я выкрыла, што старшыня калгаса Рупец Фёдар, загадчык гаспадаркай Трус Раман трымалі незапрыходаваных 43 пуды мукі. На праўленні калгаса аб гэтым не далі выказва. Яны разам з крамнікам сельпо Гладзевічам паладжваюць п'яны у калгасе заката самакрытыкі. Грамадскай камісіі няма. За крыцё жулікаў і злодзеяў па м пачалі ганенне. Нарэшце, 18 ліпеня гэтага года беспадстаўна мя з работы загадчыцы малочнафермы і паставілі былога злодзея-матэрыяліста.

МІРА.

НАРКОМУ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ тав. СУРТА.

ХВОРАЯ БОЛЬНІЦА

(ПІСЬМО СЛУЖАЧАГА)

У гэтым годзе ў Стара-Дарожскім раёне адкрылі больніцу. І ўжо штукатурка адстае, дах працякае. У пакоях, дзе ляжаць хворыя, у час дажджу цэлыя лужы вады. Не хапае пасуды. Есці даюць па чарзе, у адной місцы з заразнымі хворымі. Ваду хворым бяруць з калодзежа, які неачышчан.

Конюхам у больніцы працуе Валодзька, які за адвозку хворых патрабуе ад іх платы, а калі хто не можа заплаціць, то ён скідае іх на дарозе. Карэлін, як загадчык больніцы, ніякіх мер не прымае.

ГІМЕЛЬШТЭЙН.

УПАЎНАВАЖАНАМУ МІСІІ СОВЕЦКАГА КАНТРОЛЯ БССР ТАВ. ІВАНОВУ

АБ АМАТАРАХ АБ'ЯЦЬ

(ПІСЬМО РАБОЧЫ)

Некалькі раз пытанне пабудове дома для рабочых Крупскага хлебазавода разглядалі заўкомы і ў трэсце Белпромхлеб.

Складалі планы і штарысы. Дырэктар хлебазавода тав. Сакснаў сам некалькі разоў езадзіў у трэст. Але трэстаўскія чыноўнікі толькі і робяць, што мяць абяцанкамі. А рабочыя года дагэтуль астаюцца без даху.

КІТАН, ГУШЫЦ.

РАСКРАДВАЛЬНІКІ МАЛОЧНАЙ ПРАДУКЦЫІ

(Агляд пісем селькораў)

Аднэй з прычын нездавальняючага становішча малакопаставак з'яўляецца дрэнная работа прыёмачных пунктаў і маслазаводаў. У многіх раёнах на пунктах акапаліся варожыя элементы, раскрадваючыя дзяржаўную прадукцыю.

Прывядзем два характэрныя прыклады.

Маслазаводам у Гаспадоўскім сельсавеце, Горацкага раёна, загадвае Аўсей Пішчэта, Доўга думаў ён, як знайсці спосаб, каб бесперашкодна прысвойваць малочную прадукцыю. Ніяк не мог прыдумаць. Адкрыта заняцца жульніцкімі махінацыямі небяспечна—могуць злавіць. Што рабіць?

На дапамогу прышоў сабака. Завод утрымліваецца ў такім «парадку», што сабака лёгка пралез у пограб, з'еў дзве галоўкі сыру. Склалі акт і прыпісалі адну галоўку ў сваю карысць. Другі раз сабака знішчыў каля кілограма масла. У акце-ж запісана 3 кілограмы. І сабака сыты, і загадчыку добра. Трэба дзякаваць сабаку.

Загадчык Засінцаўскага сепаратарнага пункта, Скарадзянскага маслазавода (Ельскі раён) Худабен Янка зрабіў прасцей. Ён арганізаваў хэўру раскрадвальнікаў малочнай прадукцыі, у якую ўвайшлі, акрамя яго, загадчык МТФ калгасаў «Шлях социялізма» і «Шлях Леніна» М. Харашкевіч і М. Хлец.

Яны амаль штодзённа кралі на пункце сліўкі малако. Каб утаіць сляды злачынстваў, хэўра занялася падробкамі, пускала калгасы і калгаснікаў пр прыёме малака. Худабенка такі чынам ашукаў, адзін толькі калгас «Перамога» на 20 літраў. Калі, напрыклад, здае 56 літраў малака, а ў прыёмачным журнале запісваецца—46 літраў. 4 літры высвоены.

Загадчык-ж МТФ дапамагалі злачынным махінацыям Худабенка тым, што адавалі малако без усякага ўліку.

Іншым загадчык фермы калгаса «Шлях социялізма» Харашкевіч—былы кулак, цвёрдазаданнік, пралезшы на кіруючую работу ў калгас.

Раскрадвальнікаў социялістычнай маемасці трэба неадкладна прыцягнуць да самай суровай адказнасці.

(Агляд напісан на аснове пісем селькораў тт. Ф. Сцефаненка, М. В., Я. В.).

ЖУЛІКІ Ў ЧЭРВЕНЬСКАГА ЛЕСПРАМГАСА

Павышэнне цэн, абзываннe, ашукванне спажыўца шырока ўкаранілася ў ОРС'е Чэрвеньскага леспрамгаса. Так, круп пярловы замест 52 кап. за кілограм прадаваліся па 65 кап. З 1 студзеня па гэты час крамі ОРС'а прадалі 16.521 кілограм круп. Такім чынам перабрана ад спажыўца 2.147 руб. У крамах ОРС'а завышаюць таксама цэны і на іншыя прадукты: цукар замест 4 р. 7 кап. прадаюць па 4 р. 22 кап., хлеб прадаюць па 53 капейкі за кілограм замест устаноўленай цаны 50 кап.

Нядаўна крамы ОРС'а атрымалі рыбу (воблу і сазан) у колькасці 1537 кілограмаў, прычым па накладной вобла каштавала 84 кап., а сазан—1 р. 47 кап. кілограм. У крамах-жа прадавалі воблу па 1 р. 34 кап. кг. Такім чынам перабралі ад рабочага спажыўца 1.782 руб. Селядцы павінны былі прадавацца па 1 р. 30 кап., а прадавалі па 1 р. 70 кап., кансервы, замест устаноўленай цаны па 3 руб. 2 кап., прадаваліся па 3 р. 48 к.

Бухгалтар ОРС'а тав. Алешчанкін тлумачыць перавышэнне цэн тым, што ОРС рахункі - фактуры атрымлівае значна пазней, чым тавары. Між тым, рахункі часта прыходзяць адначасова з таварам, а цэны на гэтыя тавары ўсё роўна завялічаны.

На базе ОРС'а ляжаць зімовыя полты аднолькавай якасці, аднолькавага размеру і колеру, але кошт іх розны. Адно паліто каштуе 81 р. 1 кап., а другое — 108 руб. 50 кап., трэцяе — 109 руб. і т. д.

Павышэнне цэн мае месца ва ўсіх крамах ОРС'а. Так, прадаўчык Грабянеўскай крамы Суша прадае цукар па 3 р. 67 кап. замест 3 руб. 57 кап. У руднянскай краме Кастусь Заль увесь час ашуквае рабочых лесазагатовак. Ён наўмысна не даваў кляймёнай настольнай вагі, бо адна талерка важыла больш другой на 11 грамаў. У стара-прудскай краме Кацько прадае літр газы па 99 к. замест 72.

Ні ў адной краме ОРС'а няма метраў. Мануфактуру мераюць па зарубках, якія зроблены на сталах.

Прыведзеныя намі факты сведчаць аб тым, што кіраўніцтва Чэрвеньскага ОРС'а страціла класавую пільнасць, пакрывае злачынцаў. Яно ведае аб фактах абважвання, ашукання, абмерывання спажыўца, аб растратах. Але сапраўдных мер не прымае.

За 1933 і першую палову 1934 года растраты па грамадскаму харчаванню складаюць 19.225 руб., а па крамах — 4.646 руб 90 кап. Але з 19 асоб, вінаватых у растраце, прыцягнуты да судовай адказнасці толькі чатыры.

Бухгалтэрыя ОРС'а Чэрвеньскага леспрамгаса надзвычай заблытана. Да апошняга часу там працаваў у якасці галоўнага бухгалтара былы поп Астраглазаў. Начальнік ОРС'а тав. Старасельскі ведаў аб гэтым, але абмежаваўся толькі тым, што зволіў Астраглазава з работы, не прыцягнуўшы яго да адказнасці за заблытанасць бухгалтэрыі.

Мы патрабуем ад кіраўнікоў Чэрвеньскага леспрамгаса і Лесбела неадкладна заняцца пытаннем падбору кадраў для ОРС'аў леспрамгасаў.

Рэдактар газеты «Ударник леса» КАЦ.

ПАД МАСКАЙ РАБСЕЛЬКОРА

З раду атрыманых намі пісем Жлобінскага раёна мы выбралі два пісьмы пад загалоўкамі «Дакуль будуць арудаваць кулакі» за подпісам Шаўцова і «Група шкоднікаў павінна быць асуджана» за подпісам Трыфаненка С.

Наш спецыяльны карэспандэнт выязджаў у гэтыя калгасы для высвятлення фактаў, указаных у гэтых пісьмах.

У сваёй карэспандэнцыі пад загалоўкам «Дакуль будуць арудаваць кулакі» Шаўцоў прыводзіць факты, што ў калгасе «Серп і молат», Мормальскага сельсовета, стагаванне сена праводзена парушэннямі, што збожжа звезена сырое, што на ферме гінулі парасяты і т. д.

Расследваннем гэтыя факты не пацвердзіліся. Але мы спынімся на характарыстыцы аўтара. Хто такі Шаўцоў Сцяпан — брат Шаўцова Міколы, галоўнай дзеючай асобы.

Шаўцоў Сцяпан — 15-гадовы хлапчук, які сёлета скончыў сямігодку. Сцяпан пасля школы заходзіў у сельсавет, браў з сабой пошту і разносіў яе па пунктах, размешчаных на дарозе да хаты, прыблізна радыусам у 10 кілометраў і атрымліваў за гэта 15 прадзён у месяц.

Падвучаны братам, Сцяпан пачаў патрабаваць у праўлення, каб яму за разноску пошты плацілі 30 працадзён у месяц. Яму ў гэтым адмовілі, тады Сцяпан пачаў манкіраваць работай. Яго ад абавязкаў пісьманосца аслабанілі. Пасля гэтага ён актыўна прымыкае к лагеру незадаволеных, узначальваемых яго братам Міколай, і піша паклёпніцкае пісьмо ў рэдакцыю.

Аб сутнасці пісьма мы сёння спыніліся мала, бо не ў гэтым галоўнае, а галоўнае ў тым, што пад выглядам абаронцаў калгаса гэтыя людзі імкнуцца разбурыць калгас. Зараз мы дамо характарыстыку Шаўцова Міколы і яго сатрытнікаў.

Шаўцоў Мікола, будучы брыгадзірам, даваў работу толькі тым, хто з ім п'янстваваў, або даваў яму грошы на выпіўку. І зараз у старшыні калгаса «Серп і молат» тав. Ніжнікава ёсць заявы калгаснікаў з просьбай выдаць ім аванс грашыма для таго, каб купіць брыгадзіру тарэлкі, бо інакш Шаўцоў іх не бярэ на работу.

Шаўцоў Мікола таксама не любіць крытыкі. Калі напісалі пра дрэнную работу яго брыгады ў насенгазеце, то ён яе сарваў. Праўда, за гэта нарсуд даў яму 6 месяцаў прымусовай працы.

Шаўцоў Мікола таксама судзіўся за пакражу 142 клг. збожжа.

Другія саратнікі Шаўцова —Салагуб Іван — былы рахункавод. Салагуб паўмысна, помсцячы за тое, што яго знялі з рахункаводства, сёк 20 маладых ліп і за гэта судзіўся. Ён патрабаваў ад кладаўшчыка паўтара пуда жыта на выпіўку. Асадчы Васіль знят з работы і аддан пад суд за перабор гарнцавага збору, за растрату памольнага збору.

І вось гэта цёплая кампанія зайняцца цкаванням кіраўніцтва калгаса — старшыні Ніжнікава, парторга Іткіна.

Калі разследзець аўтара другога пісьма з калгаса «Чырвоны дуб», Лукаўскага сельсовета, то мы сустрэнемся з яшчэ больш агіднымі з'явішчам. У заметцы «Група шкоднікаў павінна быць асуджана», прыводзяцца факты, што старшыня Хадкевіч Мікіта забраў сабе 5 свіней і парасят, што ў калгасе гіне бульба, а старшыня карыстаецца свірнам, які забран у раскулачанага, і не дае туды бульбу сыпаць, што старшыня паставіў конюхам свайго прыяцеля Баева Кірылу, што старшыня займаецца сістэматычным п'янствам і разбурае калгас. Пад гэтай заметкай стаіць подпіс Трыфаненка В. С. з просьбай надрукаваць заметку пад псеўдонімам «Вока».

Разгледзім, ці ёсць такі ў калгасе «Чырвоны дуб»? Ёсць. Ці пісаў ён гэты матэрыял? Не, не пісаў. Ён ад гэтага адмаўляецца, дый мы самі ўстанавілі, што аўтар пісьма не Трыфаненка, а нехта другі. Друкуем тэкст выданай нам даведкі.

«ДАВЕДКА

Матэрыял пад загалоўкам «Група шкоднікаў павінна быць асуджана», падпісаны Трыфаненка В., як відаць са зверкі почаркаў, маючыхся ў справах міліцыі, пісан рукой участковага міліцыянера Зайцава — Сына Зайцава Лукаша, пражываючага ў калгасе «Чырвоны дуб».

(подпіс)».

Хто такі Зайцаў Лукаш? Хітры, правырлівы стары, меў у 1931 годзе цвёрдае заданне, здолеў нейкім чынам пралезці ў калгас і імкнецца там наводзіць свае парадкі. Нядаўна па заданню Зайцава пачалі ўжо складваць у стагі сырое сена, што пагражала псаваннем гэтых стагоў. Але дзякуючы таму, што ў гэту справу ўмяшаўся старшыня калгаса і брыгадзір, сена не сталі складваць у стагі.

Зайцаў блакіруецца ў сваёй рабоце з Баевым Кірылам, які нядаўна, будучы конюхам, загарадзіў мост дротам і загнаў туды ўсіх коней. Коні пачалі грызці адзін другога, у выніку адна кабыла, якая раней належала Баеву, напаролася на кол. Баеў да апошняга часу быў рахункаводам калгаса, але знят за дрэнную работу.

Як відаць з усяго матэрыяла, Зайцаў — сынок з-за салідарнасці з бацькай Лукашом імкнецца праз друк зводзіць асабістыя рахункі, падпісваючы чужым прозвішчам заметку, ён свядома займаўся падробкай подпісаў.

Некалькі слоў па сутнасці самых калгасаў. Трэба сказаць, што як «Серп і молат», так і «Чырвоны дуб» добра спраўляліся з выкананнем с.-г. кампаній. «Серп і молат» ужо цалкам разлічыўся з дзяржавай, унёс натураплату, скончыў асенняю сяўбу і ў гэтым калгасе за ўвесь 1934 год на свінаферме не загінула ні адваго парасяці. Амаль такое-ж становішча мы маем і ў калгасе «Чырвоны дуб».

Значыць, «крытыка» гэтых «селькораў» выходзіць не з пункту гледжання барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгаса, а з асабістых інтарэсаў, больш таго, з інтарэсаў падарваць калгас.

Гэтыя два пісьмы — характэрны паказ, як асобныя людзі пад выглядам рабселькораў імкнуцца бістых інтарэсах і як на мясцах не заўважваюць гэтага, недаацэньваюць работу з сапраўднымі рабселькорамі, не бачаць класавай барацьбы ўнутры калгаса.

С. Ц.

САМАЯ ПАЧЭСНАЯ ЗАДАЧА СОВЕЦКАГА ПІСЬМЕННІКА — ВЫХАВАННЕ МАСТАЦКІМ СЛОВАМ ГЕРАІЗМА ПРАЦЫ І АБАРОНЫ СОВЕЦКАГА САЮЗА

ДРАМАТУРГІЯ СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

(З прамовы тав. Х. ДУНЦА на Усесаюзным з'ездзе пісьменнікаў)

— Драматургія нацыянальных рэспублік, можа быць за выключэннем украінскай, адстае ад рускай драматургіі. Рад акалічнасцей перашкаджаў разгортванню нацыянальнага тэатра. Калі гаварыць пра беларускі, яўрэйскі, польскі тэатры, то толькі-ж Акцябрская рэволюцыя іх парадзіла. Але ў гэтай галіне многае ўжо дасягнута. Тав. Клімковіч у сваім дакладзе закрануў пытанні нашай драматургіі, а я-б хацеў сказаць толькі пра ўзаемасувязь і ўзаемаўплыў драматургіі народаў СССР.

Калі прыглядзецца да развіцця драматургіі Беларусі, можна заўважыць наступны характэрны гістарычны факт. Актывізацыя нацыянал-дэмакратаў супроць совецкага тэатра адбылася ў часе пастаноўкі на беларускай сцэне п'есы Вс. Іванова «Бронепоезд». Гэта было ў 1927 г. Тады з гнілога эрзацу буржуазнай ідэалогіі нацыяналістычнымі элементамі Беларусі была выцягнута тэорыйкі абгрунтаванне таму, што, моў, беларускі тэатр не адпавядае інша-нацыянальных характараў, што сібірскага партызана (чырвонага, зразумела!) беларускі актор не можа паказаць, што калі, моў, паказаць «чужароднае», «чужаземнае», то гэта тэма будзе ў адносінах да ўзораў заходніх (зразумела, буржуазных) літаратуры і драматургіі.

«Бронепоезд» Вс. Іванова аказаўся брэнчаным кулаком у руках нашых у барацьбе супроць дзейнай агітацыі шавінізма.

Аб чым гэта гаворыць? Гэта ёсць яркае сведчанне магутнага ўплыву совецкай драматургіі на беларускую нацыянальную культуру. Удар нарадзіўся на беларускіх нацыянал-дэмакратах мабілізаваў новыя сілы драматургіі.

Створаная першая вытворчая п'еса «Гуды» Кобеца, прайшоўшая в поспехам у Беларусі, у іншых рэспубліках і ў разве рабочых, тэатрах [illegible]ніцы.

П'еса [illegible] Александровіча «Натар» [illegible] нацыяналістычную драматургію [illegible] тэмай (ліквідацыя прадраўнікоў на заводзе), сваімі вобразамі [illegible] новая комсамольская моладзь), [illegible] тонам, «музыкай» твора, [illegible] якой няма надтрэсканага сэнсу, а ёсць радасць совецкага быцця. Дзе-ж тут нацыянальная форма? Яна і ў мелодыцы пісьма, і ў трансфармаванні беларускага фальклора, і ў вобразах (пераробка сырога чалавечага матэрыяла з дасталай вёскі).

Бой «нацыянальнай рамантыкі» даюць беларускія драматургі сваімі далейшымі творамі («Качагары» Гурскага і інш.). П'еса Чорнага «Бацькаўшчына», не гледзячы на рад зрываў у галіне формы, праўдзіва паказае шлях селяніна Леапольда Гушчы жыццёвым ідэалам якога раней з'яўлялася прыватная ўласнасць да новай соцыялістычнай радзімы.

У конкурсе на лепшы драматургічны твор мы атрымалі рад п'ес, амела трактуючых пытанні і праблемы, маючыя агульнасаюзны інтарэс. П'еса Крапіны «Канец дружбы» трактуе праблему партыйнай этыкі, новых раемаразуменняў на аснове соцыялістычнай рэчаіснасці. Гэта рэчаіснасць бярэцца ў канкрэтных нацыянальных формах.

З'яўленне п'есы Галаўнера «Великодушие» з'яўляецца фактам росту кругавіду нашых драматургаў і фактам пашырэння тэматыкі. Яна зроблена на матэрыяле Парыжскай камуны. Характэрнай з пункту гледжання адлюстравання элементаў міжнароднай рэволюцыі ў драматургіі з'яўляецца таксама «Сімфонія гнева» Шашалевіча, у якой аўтар, у мінулым абцяжаны нацыянал-дэмакратычным грузам, паказвае пералом у настроях заходняй інтэлігенцыі ў бок пролетарыята.

Аналагічныя беларускай драматургіі працэсы, своеасабліва праломленыя, адбываліся ў яўрэйскай совецкай драматургіі. Пасля Акцябра ў цэнтры ўвагі яўрэйскіх тэатраў стаялі творы Шолам-Алейхема, Перэца, п'есы Аша і інш. Тэатры ў радзе выпадкаў не здолелі перамагчы нацыяналістычны, місціка-сіяналістычны, местачкова-ўпадніцкі дух гэтых п'ес. Пераймание класікі і рабскае капіраванне яе форм прывялі да рапу правалаў драматургіі (ранняя п'есы Фейюркі, Рэзніка і інш.). З'яўленне новай совецкай драматургіі ў выглядзе п'ес Кушнірова («Лекерт»), Вевюркі («Ботвін»), Бергельсона («Глухі»), п'ес Добрушына і інш., з'яўляе сабой новую паласу барацьбы за ўцвярджэнне рэволюцыйнага тыпажа, за паказ рэволюцыйнай барацьбы.

Гэтыя першыя п'есы расчысцілі шлях новай совецкай тэматыцы соцыялістычнага будаўніцтва. І такія п'есы, як «Суд ідзе» і «На 62-м вучастку» Добрушына, «Плацінка» Орланда, «5-ы гарызонт» і «Ніт гедайгэт» Маркіша, «Шахта» Альбертона і інш. ужо з'яўляюцца небеспасцяховымі спробамі паказаць новага совецкага чалавека, пераробку яўрэйскага працоўнага на аснове будаўніцтва соцыялізма.

Роўнапалежна развіваецца драматургія на тэматыцы грамадзянскай вайны («Мера строгости» Бергельсона, «Юліс» Данізля і інш.), па тэмах інтэрнацыянальнай барацьбы пролетарыята («Джым Куперкоп» Годьнера, «Забастоўка жняцоў» Зускіна Льва і інш.).

Што датычыць польскай драматургіі, то трэба сказаць, што яе рост зусім недастатковы. У 1934 годзе польскі тэатр быў вымушан ставіць выключна п'есы з агульнага рэпертуара, не маючы ў наяўнасці арыгінальных польскіх п'ес. Напрошваецца вывад, што мала яшчэ зроблена для развіцця польскай драматургіі.

Беларусь знаходзіцца на граніцы з буржуазным Захадам. На ўсходзе мацнее новая яўрэйская аўтаномная вобласць Біробіджан. Польская совецкая культура расцвітае ў БССР і УССР. Беларуская, яўрэйская і польская драматургія будуць расці бурна, яны будуць кавацца пачуццём любві і адданасці сваёй краіне, сваёй партыі, свайму Сталіну! (Апладысменты).

З усведамленнем вялікага росту

(З прамовы тав. М. ЛЫНЬКОВА на Усесаюзным з'ездзе пісьменнікаў)

Адным з асноўных патрабаванняў метада соцыялістычнага рэалізма з'яўляецца актыўны ўдзел пісьменніка ў адлюстроўваемым жыцці, яго шчырая любоў да ствараемага намі свету, поўная, глыбокая зацікаўленасць у працэсе перабудовы і вялікая праўдзівасць творчасці. Спакою, халоднаму, бесстрасному адлюстраванню няма месца ў нашай літаратуры.

Толькі вялікая любоў да нашага жыцця дапамагла Янку Купале ў нашай беларускай літаратуры стварыць выдатную паэму «Над рэкою Арэсай», прысвечаную перабудове зямлі і чалавечай душы. Гэта вялікая любоў, вялікая асабістая адказнасць за совецкую справу, за большэвіцкую справу рухала пяром Якуба Коласа, напісаўшага «Адпачаненец», «Дрыгву». Толькі стаўшы ўшчыльную да жыцця, гэтыя два буйныя мастакі стварылі творы, якімі зачытваюцца тысячы чытачоў. Сэрцы і пісьменніка, і чытача пачалі біцца ва унісон, напоўніліся ўзаемным разуменнем, агульнымі мэтамі.

Гэта можна сказаць і пра такога пісьменніка як Змітрок Бядуля. Я не гавару аб плеядзе маладых, аб комуністах Александровічу, Галавачу, Мурашку, Гурскім, аб беспартыйных — Чорным, Крапіве, Самуйлёнку, Броўку, Глебку і дзесятках іншых. Яны ўсе ўзрошчаны рэволюцыяй, яны—не прыгожае квітненне, яркае, маляўнічае. Ёсць і ў нас што паказаць, ёсць што накласці ў агульную скарбніцу саюзнай літаратуры.

Што перашкаджала нам дагэтуль больш шырока выйсці на ўсесаюзную творчую арэну? Па першае, нашы ворагі, нацыянал-дэмакраты і вялікадзяржаўнікі, якія стараліся збіць нашу літаратуру з адзіна правільных ленінскіх шляхоў яе развіцця і тым прыніжалі яе, тармазілі яе рост.

Далей, мы яшчэ бываем часамі вельмі калючымі, непрыгладжанымі, каравымі, нам не хапае яшчэ тварытычнага асмыслівання свайго творчага вопыта, часта не хапае і шырокіх рознабокіх ведаў, сапраўднай культуры, глыбокага марксістка-ленінскага разумення нашай рэчаіснасці. Большасць нашых пісьменнікаў у апошні час з выключнай вострасцю адчула неабходнасць самай упартай работы над культурай і прымала рашучыя моры да аўладання ёю. Ім трэба дапамагчы ў гэтым, дапамагчы арганізацыяй, парадай і разумным кіраўніцтвам.

Тут-жа, у сувязі з вучобай, паўстае другое вострае пытанне адносна арганізацыі пісьменніцкага часу, адносна ліквідацыі непадпучальных прагулаў і фактрат часу, якія ў нашым асяродзіччы

маюць большае месца, чым у якой-бы там ні было іншай грамадскай і прафесіянальнай арганізацыі.

Пра перакладчыкаў. Часамі лепшыя нашы творы пад рукой заўрад-перакладчыкаў, якія не ведаюць нашай мовы і яшчэ менш — багатай рускай мовы, трацяць усякае паэтычнае гучэнне, усю спецыфіку высокага мастацкага абазнання і ператвараюцца ў нешта няўдалае. Усе гэтыя недахопы бываюць часта не па нашай злой волі, а ў большасці выпадкаў бываюць па нашай маладосці і няпоўнасці.

Але, як вядома, маладосць — не ганьба і не яшчасце. Гэту «бяду» мы лёгка зжываем і зжывем, тым больш, што ёсць у нас у каго павучыцца, што жывем мы дружнай брацкай сям'ёй, што забяспечана сапраўдная і ўсебаковая дапамога. Мы, беларусы, з асаблівым задаваленнем сустрэлі, напрыклад, артыкулы Гладкова пра творчасць раду украінскіх пісьменнікаў. Аналагічную работу правялі ў нас Бахмецьеў, Ліцвін, Ясенскі і іншыя таварышы. Думаем, што гэта работа стане яшчэ глыбей і рознастайней.

Ёсць і ў нас чаму павучыцца: нашай барацьбе за правільныя шляхі развіцця мовы, за яе чыстату, нашаму ўменню не адрываць развіццё літаратуры ад агульнага ходу культурнай рэволюцыі ў краіне, нашай барацьбе за здзіўляючыя тэмпы агульнага культурнага і эканамічнага росту нашых рэспублік, нашых народаў і ўсяму таму новаму, свежаму, што ўносім мы — маладыя літаратары — ў вялікае рэчышча агульначалавечай пролетарскай культуры.

Думаю, што да II з'езда мы ў некалькі раз прыўмножым скарбніцу нашай літаратуры, павысім яе голас, напоўнім яе поўнацэнным зместам і вялікім мастацкім гучэннем.

Мы выраслі. З усведамленнем вялікага росту мы прыйшлі на з'езд. З усведамленнем яшчэ больш перспектыў нашага росту мы раз'ядземся адсюль. Гэтае ўсведамленне ўмацоўваецца ў нас нашымі сіламі, нашымі поспехамі, брацкім яднаннем і ўзаемнай дапамогай. Гэтае ўсведамленне ўмацоўваецца і тым, што на чале нас стаіць вопытнейшы і талантлівейшы настаўнік Алексей Максімавіч і кіруе ўсімі намі вялікі і любімы таварыш Сталін. (Апладысменты).

СМЯЛЕЙ ГЛЯНУЦЬ У БУДУЧЫНЮ

(З прамовы тав. І. ХАРЫКА на Усесаюзным з'ездзе пісьменнікаў)

— У 1926 г. вёны яўрэйскі нацыяналістычны пісьменнік Амерыкі пісаў пра нас наступнае: «Яўрэйская совецкая паэзія жыве пад халодным сярэбрным месяцам, яна адчувае сябе адзінокай, збянтэжанай».

Ужо тады гэтыя ўмазаключэнні выклікалі ў нашых радах смех. Гаварыць аб сапраўдным развіцці яўрэйскай паэзіі—гэта значыць гаварыць аб яўрэйскай совецкай паэзіі, аб яўрэйскай паэзіі Совецкага Саюза. Гэту паэзію творыць здаровае пасляокцябрскае пакаленне, якому дана спяваць ва ўвесь голас, любіць і ненавідзець.

Такія паэты, як Фефер, Маркіш, Квітко, Кульбак, сведчаць аб вялікім росце яўрэйскай паэзіі. Бясспрэчны ідэйны творчы рост такіх лірыкаў, як Галкін, Росін, Аксельрод і Камянецкі.

Некалькі год назад прыехаў да нас яўрэйскі буржуазны пісьменнік Шолам Аш, аўтар апавесці «Мястэчка». Ён усё жыццё паказвае мястэчка як суцэльную суботу. Увесь свет ён ахутвае ў сінагагальны талес.

Чаго ён шукаў у нас? Яго цікавіла: ці поўна сінагога малянчыміся, ці добра развіваюцца яшчэ яны ім багачы, ці добрасумленна вывучаюць яўрэйскія дзеці талмуд і ці самабытна мястэчка.

Паехаў ён значна расчараваным. Ён не знайшоў таго, чаго шукаў, бо нацыянальна-стылізаванае мястэчка Аша і наша рэальнае мястэчка, уключанае ў соцыялістычную будоўлю і паказанае ў нашай літаратуры,—гэта два светы. Памёрла старая адзінокая правінцыя і разам з ёй сумная муза яўрэйскіх Рэйзінаў і Эйгорнаў, знік стары быт і разам з ім стары слязлівы смутак.

Бо толькі ж у нашай краіне, дзе Пушкіна чытаюць нават на льдзіне, дзе Маякоўскага чытаюць на плошчах, толькі ў нас магла развіцца шматмоўная адзіная талантлівая совецкая паэзія.

Калі вершы беларускага паэта Александровіча або вершы яўрэйскага паэта Фефера пранікаюць нават да нашых таварышоў, якія сядзяць у казематах не так аддалёных краін, то гэта-ж перамога ўсёй совецкай паэзіі. Такую паэзію нельга вымяраць фармалістычнымі набракушкамі. Мы ні ў якім выпадку не павінны адмовіцца ад далейшых фармальных шуканняў, але арыгінальныя асапансы і галаваломныя, надуманыя вобразы яшчэ невыратоўваюць ад эпігонства і не з'яўляюцца наватарствам.

Мала быць паэтам талантлівых радкоў або строф, трэба яшчэ быць паэтам талантлівых цэльных кампазіцыйна-стройных рэволюцыйных вершаў. Як часта верш складаецца з вельмі вобразных строф, а ў цэлым гэты верш малавобразны, бязвобразны і часта нават жіцны!

Усім нам, напрыклад, добра запомніўся верш Нікалая Дземянцьева «Мяць», або некаторыя вершы Гусева і Галоднага. Яшчэ дагэтуль свежа гучаць такія вершы, як «Грэнада» Свэтлова, «Баллада о гвоздях» Н. Тіханава, «Песня о шашке» Безыменскага, «На майдане» Тычыны, «Мінеральныя воды» Броўкі, «Восстание» Шварцмана. Гэта тлумачыцца тым, што ў іх адчуваецца новы подыхід да тэмы, цэльная кампазіцыя і арыгінальны подыхід да нашай рэволюцыйнай рэчаіснасці. Такія вершы не распадаюцца на паасобныя ўдалыя радкі.

Мы ўсе любім і цэнім вялікую спадчыну Маякоўскага, але ці не пагражае, скажам, таму-ж самаму паэту Кірсанаву небяспека знешняга наследвання Маякоўскаму? «Во весь голос»—гэта-ж не значыць надрываць голас. «Бенгальскі агонь» яшчэ яе з'яўляецца агнём нашых баёў. Трымаючы ў руках карту і глобус і вадзіць ім нальцам—гэта яшчэ не значыць бачыць зямны шар або хоць-бы адну шостую частку яго. Вельмі шмат бедных сваякоў з'явілася ў вялікага Маякоўскага. Узяць хоць-бы паэму Кірсанава «Пятилетка». Яна поўнасцю сучадае з планам Дзяржплана, але ў той час як за планам Дзяржплана стаіць наша глыбокая рэальная рэчаіснасць, у гэтай паэме мы верш за ўсё адчуваем добрае веданне падручніка геаграфіі.

Вельмі шкода, што т. Бухарын не закрануў у сваім дакладзе літаратур народаў СССР: гэта ва многім-бы ўзбагаціла яго даклад. Узяць хоць-бы пытанне далейшага развіцця паэмы, якое многіх з нас вельмі цікавіць. Гэта пытанне не закранута тав. Бухарыным, а між тым паэзія народаў СССР мае ўжо багаты вопыт перамог і паражэнняў. Спробка Эрэнбурга і Ясенскага аб сюжэтнасці і займальнасці прозы актуальна таксама і для нас, паэтаў. Неправы тыя таварышы, якія ўмаляюць значэнне сюжэта. Не толькі паэма, але і нават лірыка імкнецца да сюжэтнасці, сюжэт—гэта не глупства. Разгарнуць цэльны сюжэт у паэме і пры гэтым не скаціцца да халодных рыфмаваных радкоў або да простага перайманя Пушкіна—цяжкая і не зусім яшчэ распрацаваная задача.

Такія цікавыя паэмы яўрэйскай совецкай паэзіі, як «Пласты», «Братья» Маркіша, «Чайльд Гарольд з Дзісны» Кульбака таксама не вылаюцца стройным сюжэтам і займальнасцю, яны шматпланавы.

Наша жыццё вядзе нас да вялікіх маштабаў, і мы яшчэ актыўней павінны ўключыцца ў наша вялікае, сапраўднае лепшае, вывучыць мінулае і смялей заглянуць у нашу будучыню—у блізкае бяскласавае соцыялістычнае грамадства. (Апладысменты).

Беларуская дэлегацыя [illegible] ВЦВК і арганізацыйнага камітэта

ДАВАЦЬ ЛЁН НА ЎСЬ

МІХА[illegible]АЛАЕ САРТАВАННЕ ІЛЬНУ ПАВЫШ[illegible] А ГАРТНЫ

ЎКАМ ІЛЬНУ І ПЯНЬКІ—БОЛЬШЭВІЦК[illegible]

Я прышоў на з'е[illegible] вонай армі, дзе ка[illegible] удасканальваў свае [illegible] паэт-большэвік паніне[illegible] рага [illegible] толькі маста[illegible] калі г[illegible] патрабуе п[illegible] ваеннай тэхнікай.

Я ў нашай армі [illegible] чытае прозу, чытае [illegible] ца ў літаратурным т[illegible] та не горш некаторых [illegible] ватыкаў. Больш таго, [illegible] нас няма больш [illegible] нага і ўважлівага ч[illegible] нашай Чырвонай арм[illegible] чытачом мне стала к[illegible] не даем яму тое, шт[illegible] трабуе.

Мы павінны даць не толькі высокамастацкія творы, адлюстроўваючыя нашу новую краіну і новага чалавека, але і такія, якія вучаць нас абараняць гэту краіну і шчасце людзей, стваральных яе.

Мы павінны стварыць такія кнігі, якія-б псіхалагічна падрыхтоўвалі нашага грамадзяніна да абароны бацькаўшчыны, якія-б выхоўвалі ў ім волю, гераізм, самаадданасць, самахвярнасць, якія-б выхоўвалі ў ім такое пачуццё, што няма і не можа быць для нас вышэйшага гонару, чым адстаяць інтарэсы соцыялістычнай радзімы.

КУЗЬМА ЧОРНЫ

Для літаратур капіталістычных краін вельмі характэрна з'явішча ўядання талантаў. Мастак супакойваецца на дасягнутым, ён адрываецца ад жыцця і фарбы на яго палітры хутка засыхаюць у стаячай атмасферы кабінета, нават у тым выпадку, калі пісьменнік ужо даўно пакінуў традыцыйную мансарду і выбраўся з багемавай дрыгвы.

У нас гэтага не можа быць. Той, хто ўзяў пяро з цвёрдым рашэннем аддаць усе свае здольнасці служэнню справе пролетарскага мастацтва, таго не можа сустрэць творчая дэпрэсія, бо пісьменнік прымае ўдзел у соцыялістычным будаўніцтве, бо яго абавязвае шукаць, пракаваць і расці мудрая воля партыі. Энергетычная база для яго з'яўляецца цевычарнальныя крыніцы энтузіязма мільённых мас будаўнікоў соцыялізма. Совецкаму пісьменніку даны фарбы даўнай харошасці, цудоўнай жыццёвай яснасці. І мы гэта павінны выкарыстаць для стварэння высокамастацкіх палотнаў.

[illegible] на БССР загатоў[illegible] Ільнанасення, 0,4 [illegible] на, 6,9 проц. ільна [illegible] ў літаратурным т[illegible] ня канаплі здана [illegible] загатовак пынькі [illegible] 5 разоў [illegible] валакна 12,5 цэнтн. і трасты 61 цэнтн. Насення ільну здаў [illegible] 18 [illegible] пэнтн.

[illegible] ка, не ў прык[illegible] ам, не адставалі [illegible] мпа хлебаздачы. [illegible] выканалі свой [illegible] оп.

[illegible] ысай у барацьбе [illegible] ыканание хлеба[illegible] імкненне адна[illegible] дь чэсна і добра[illegible] з калгасамі свае [illegible] перад дзяржавай. [illegible] прышлося нямала [illegible] тым, каб падцяг[illegible] льш цяжкі і рас[illegible] У рэзультаце [illegible] калгасы звыш 600 аднаасобнікаў. Тое-ж самае мы пагладзем у Барысаўскім, Бярэзінскім, Хойніцкім і іншых раёнах, дзе за жнівень уступіла некалькі тысяч аднаасобнікаў у калгасы. Новая хваля калгаскага прыліву зараз становіцца агульнарэспубліканскай з'явай.

Выканаўшы ў цэлым па рэспубліцы дзяржаўны гадавы план, нельга не адзначыць значныя недахопы ў правядзенні гэтай работы. Калі па хлебапастаўках (1 верасня) і па звароту насеннай пазыкі (5 верасня) у нас дзяржаўны [illegible] сабе абавяза[illegible] ВКП(б) па-бо[illegible] за тое, каб вы[illegible] дарку па ўз[illegible] краёў і аблас[illegible] цэльствы па [illegible] шых элемента[illegible] ны канкэт[illegible] спавамі. Буд[illegible] кой-жа энергі[illegible] налам змагаг[illegible] рашэнняў XV[illegible] і ўказанняў [illegible] вадыра таварыш[illegible] («Правда»).

[illegible] скага раёна (старшыня тав. Мурашка Сцяпан). Гэты невялікі калгас насеяў 17 гектараў ільну. План загатовак гэтага калгаса — 12 цэнтн. ільнавалакна і 51 цэнт. трасты. На 5 верасня калгас здаў [illegible] і т. д. Так[illegible] наласобнага сек[illegible] пачатку загато[illegible] розу зрыву к[illegible] гатовак адна[illegible] Гэта апартуні[illegible] ка аднаасобн[illegible] ільну павінна [illegible] рыта.

[illegible] спрачкі па дакладах вылліся ў магутную сімфонію перамог соцыялізма. Сімфонія гучала на ўсіх мовах! Бадзёрасцю і радасцю дыхала ад кожнага выступлення. Мары ператвараюцца ў яў! У кожным дакладзе, у кожнай прамове адчувалася жалезная воля з'яднанасці шматмоўнай, шматнацыянальнай совецкай літаратуры ў Саюзе Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

ЭДУАРД САМУЛЁНАК

Велічная дэманстрацыя творчых сіл, якую прадстаўляе з сябе Усесаюзны з'езд пісьменнікаў, абавязвае кожнага мастака слова павысіць стыль работы, павялічыць творчую актыўнасць і якасць свайго пяра.

Алексей Максімавіч Горкі з трыбуны з'езда гаварыў аб высокіх задачах совецкай літаратуры. Ён сурова вучыў, аналізуючы ўвесь вопыт культуры чалавецтва, ён паказваў на вялікія ўзоры геніяльнай думкі і манументальнай сілы стварэння. Сілы буравесніка пролетарскай рэволюцыі ўказваў сваім вучням шлях да взяючых вышынь пролетарскай культуры і мастацтва.

Уся краіна слухала галасы з трыбуны Усесаюзнага з'езда. Яна чакала слова адказу ад сваіх мастакоў. І ў гэты час кожны з нас мог узважыць усё, што зроблена ім. І кожны мог зразумець, якіх намаганняў волі і сіл патрабуе ад яго партыя і краіна.

І я думаю, кожны сказаў сабе: на маёй палітры самыя лепшыя фарбы, якія калі-небудзь мей мастак. Каму многа дана, ад таго многа патрабуецца.

Рабочым, калгаснікам, байцам Чырвонай арміі прыходзіці на трыбуну з'езда. Яны патрабавалі стварэння такой літаратуры, якая-б увекавечыла дні, што з'яўляюцца зарой новага жыцця чалавека.

Новымі, высокаякаснымі мастацкімі творамі совецкія пісьменнікі даказуць, што для іх воля класа — вышэйшы закон.

ЛЕУ ЗІСКІНД

Два моманты ў першую чаргу захапілі мяне на Усесаюзным з'ездзе пісьменнікаў:

Для мяне відавочна стала велізарная работа, праробленая на літаратурнай ніве за адрэзак часу ўсяго толькі ў 17 год — такая работа ў другую эпоху патрабавала-б 170 год. Для мяне адкрылася велізарная панарама, на якой я ўбачыў выразныя гістарычныя фігуры, у якіх адлюстроўвалася эпоха. Я быў вымушан усклікнуць: так, гэта літаратура! Гэта велізарнейшае вышчалавечае характэрство, якое могуць стварыць людзі з вялікім аптымізмам.

Адначасова я быў сведкам вельмі вострай і грунтоўнай крытыкі, якая не дае ніякіх скідак на беднасць. Гэта была крытыка, якая вучыць і паказвае, якая адкрывае перад табой раней незаўважаны дзівосны свет і штурхае цябе падпарадкаваць яго інтарэсам працоўных.

І. Бабель у сваім слове сказаў: «Калі-б я быў пісьменнікам за мяжой, я даўно памёр-бы з голаду...» Гэта вялікая праўда. Але не ў гэтай праўдзе ляжыць аснова велізарнейшага літаратурнага руху ў нашай краіне. Для ўсіх шырока адкрыты дзверы, усім даны шырокія магчымасці для талантлівай творчасці.

„АНТОЛОГИЯ БЕЛОРУССКОЙ ЛИТЕРАТУРЫ"

Дзяржаўнае выдавецтва мастацкай літаратуры ў Маскве выпусціла пад агульнай рэдакцыяй В. Л. Бахмецьева і М. Клімковіча на рускай мове «Антологию белорусской литературы», складзеную С. Леўманам і М. Огнёвым.

Анталогія пачынаецца ўступным артыкулам «Ад выдавецтва», у якім падаюцца схематычныя весткі аб мінулым і сучасным становішчы эканомікі і культуры БССР. Гэты ўступ дапаўняецца даволі вялікім артыкулам М. Клімковіча, у якім аўтар спыняецца на розных этапах барацьбы з нацыяналістычнымі плынямі і ўплывамі ў беларускай літаратуры і на яе сучасным становішчы. Амала месца аўтар удзяляе асвятленню становішча польскай, яўрэйскай і літоўскай літаратур БССР.

Анталогія складаецца з двух раздзелаў: паэзіі і прозы. Па гэтых раздзелах у анталогіі прадстаўлены ўсе найбольш выдатныя празаікі і паэты БССР, пачынаючы ад народніх паэтаў Я. Купалы і Я. Коласа. Перад літаратурным матэрыялам дадзены кароткія біяграфічныя звесткі пра кожнага пісьменніка.

Яўрэйская літаратура БССР прадстаўлена Харыкам, Камянецкім і Аксельродам, польская Кавальскім. Між іншым, з творасцю Камянецкага не толькі руск але і беларускі чытач знаёміцца тут упершыню. Прыходзіцца яшчэ аз падкрэсліць слабую работу Беларускага дзяржаўнага выдавецтва, яно ніяк яшчэ не здолела даць нашму чытачу 1-2 зборнікі перакладаў вораў яўрэйскіх пісьменнікаў.

«Антологию» завяршаюць сваім публіцыстычнымі артыкуламі аб Совецкай Беларусі—яе эканоміцы, культуры, прозе і паэзіі—члены беларускай дэлегацыі арг[illegible]мітэта тт. Бахмецьеў, Лідзін, Леўман, Огнёў, Бруно Ясенскі.

Л. АПЛАН.

„ПОЭТЫ БЕЛОРУССИИ"

Да Усесаюзнага з'езда совецкіх пісьменнікаў Дзяржаўнае выдавецтва мастацкай літаратуры ў Маскве выпусціла зборнік «Поэты Белоруссии», складзены П. Броўкай.

Зборнік выгодна вылучаецца сярод іншых кніг падобнага тыпу тым, што пераважная большасць паэтаў прадстаўлена ў ім больш або менш буйнымі творамі, якія даюць магчымасць судзіць аб творчасці таго ці іншага аўтара. Так, напрыклад, Александровіч прадстаўлен паэмай «Векапомная восень», Чарот—паэмай «Сын партызана», Колас—дваццаць першым раздзелам паэмы «На шляхах волі», Глебка—двума буйнымі вершамі «Пра вясну і рэволюцыю» і «Ноч у вайсковых лагерах», Кляшторны—«Слядамі дарог» і інш. Такі падбор матэрыялаў дапамагае чытачу скласці паўнае ўражанне аб тым або іншым паэце.

Слабей зборнік знаёміць чытача з Хведаровічам, Дарожным, Крапівой.

Нямаведама чаму ўкладчык уключыў у зборнік нікчэмны верш Звонака.

Б.

АГУЛЬНА-ГАРАДСКІ СХОД ПІСЬМЕННІКАЎ

12 верасня 1934 г. у 7 гадзін вечара ў вялікім зале Дома пісьменніка склікаецца агульна-гарадскі сход пісьменнікаў, прысвечаны Усесаюзнаму з'езду пісьменнікаў.

Выступаюць тт. АЛЕКСАНДРОВІЧ, КОЛАС, ГАЛАВАЧ, ЧАРОТ, АКСЕЛЬРОД, БРОЎКА.

Уваход вольны.

...ЯЛЯНСКІЯ ХВАЛЯВАННІ Ў ІРЛАНДЫІ

Графстве Корк на 13 жніўня была значана аўкцыённая продажа жы- і фермераў надоімачыкаў. Сабраў- атоўп у 5.000 фермераў, каб пера- зяць аўкцыёну. У часе сутычкі з ...ыяй адзін фермер быў забіт. а аракена. На здымку: Паліцыя ахоў- двор, на якім павінен адбыцца дыён.

ГОД КОМПАРТЫІ ЗША

...НЬЮ-ЮРК, 10 верасня. (Улас- ...я інфармацыя). У сярэдзіне ве- ...ня спаўняецца 15 год з дня ар- ...ізацыі комуністычнай партыі ...ІА. Зараз усе арганізацыі парт- ...і рыхтуюцца да свайго слаўнага ...біляя. З гэтага часу цэнтральны ...тная партыі «Дэйлі уоркер» бу- ...е выходзіць у трох выданнях ...ажом у 60 тыс. экземпляраў. ...выданні пад назвай «Нью- ...дэйлі уоркер» будуць распаў- ...ацца ў Нью-Ёрку і яго вако- ...дах і адно выданне будзе ін- ...народнае.

НОВАЯ ВЕРСІЯ АБ ПРЫЧЫНАХ УЗМАЦНЕННЯ „БАНДЫТЫЗМА" У МАНЧЖУРЫІ

ТОКІО, 8 верасня (БЕЛТА). Паў- ...раючы вымыслы аб удзеле совец- ...іх служачых у нападах на пазды ...УЧ, газета «Цугай сіорію» аднача- ...ва высоўвае новую версію аб пры- ...нах узмацнення «бандытызма» ў ...анчжурыі, а іменна — яго сувязь ...нанкінскім урадам.

«Бандыцкія» атрады,—піша газе- ...а,—імкнуцца да той-жа мэты, што ...нанкінскі ўрад. Бандыты фактыч- ...а тайна ажыццяўляюць палітыку ...анкіна. Маштабы змовы невядомы; ...дак, не павінна быць сумненняў, ...то існуе сувязь паміж манчжур- ...кімі бандытамі і нанкінскім ура- ...дам».

ДАНЦЫГ У СТАНОВІШЧЫ НАЙГЛЫБЕЙШАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ ДЭПРЭСІІ

БЕРЛІН, 8 верасня (Інфармацыя «Правды»). Як паведамляе «Кельнішэ цэйтунг», старшыня данцыгскага сената нацыянал-соцыяліст Раўшнінг у прамове, якая перадавалася ...а радыё, прызнаў, што «Данцыг у ...учасны момант (т. зн. прыблізна ...раз 15 месяцаў панавання нацыя- ...ал-соцыялістаў. Рэд.) знаходзіцца ...а становішчы найглыбейшай эканам- ...ічнай дэпрэсіі».

Далей Раўшнінг абвясціў, што ...кае быць скарачэнне зарплаты на ...0—25 процантаў. Хто супроць гэ- ...га,—заявіў Раўшнінг, — той «дэ- ...ятыр і адраднік». І тут-жа, не ...ўзводзячы духу, Раўшнінг абяцаў ...ы ...ыможным класам зніжэнне падаг- ...ку.

КОМУНІСТЫЧНЫ РУХ У АРГЕНТЫНЕ

У Буэнос-Айрэсе, як паведамляе «Нью-йорк таймс», апублікавана справаздача міністра ўнутраных спраў аб шпаркім росце комуністычнага руху. У справаздачы ўказваецца, што толькі за 1933 год было арыштавана 1600 асоб па абвінавачанню ў комуністычнай дзейнасці. Міністр унутраных спраў скардзіцца, што большасць арыштаваных прыпушчана выпусціць на волю, бо існуючыя законы не даюць дастатковага шырокіх праў паліцыі для доўгага трымання арыштаваных пад вартай. У справаздачы канстатуецца, што ў Аргентыне ёсць каля 227 рэвалюцыйных выданняў на самых рознастайных мовах. («Известия»).

ПАКЛЁПНІЦКАЯ КАМПАНІЯ І АНТЫСОВЕЦКАЯ ТРАУЛЯ ПРАДАУЖАЮЦЦА

ХАБАРАЎСК, 7 верасня (БЕЛТА). 5-та верасня на Ўсходняй лініі КУЧ здарылася крушэнне міжнароднага поезда № 3, вышаўшага са ст. Пагранічная. Гэта крушэнне скарыстана харбінскім друкам, як повад для новых злосных і недарэчных выдумак.

Чанчунскі карэспандэнт «Дзампо цусін» зараз-жа пасля крушэння пусціў утку на тэму аб тым, што «на падставе вопытаў, праведзеных японскімі войскамі з фугасамі, якімі карысталіся бандыты для падрыхтоўкі крушэння поезда, устаноўлена совецкае паходжанне гэтых фугасаў».

Што датычыць паходжання ўсіх гэтых дзікіх вымыслаў, то той факт, што яны інспіруюцца ўказаннямі вышэйшых органаў, пацвярджаецца, у прыватнасці, заявай прадстаўніка японскага ваеннага міністэрства па поваду таго-ж крушэння 5-га верасня, заявай, апублікаванай японскай газетай «Дзі-дзі». У гэтай заяве зноў паўтараюцца вымыслы аб нейкай «совецкай змове», якая з'яўляецца нібыта прычынай крушэнняў на КУЧ, прычым прадстаўнік ваеннага міністэрства дазваляе сабе сцвярджаць, што быццам «гэта пацвердзілася ў рэзультаце прызнання многіх совецкіх грамадзян, арыштаваных манчжурскімі ўладамі». Прадстаўнік ваеннага міністэрства лічыць праведзеныя сярод совецкіх грамадзян арышты недастатковымі і рэкамендуе манчжурскім уладам далейшыя антысовецкія дзеянні, заяўляючы: «Спадзяемся, што манчжурскія ўлады правядуць больш дэтальныя росшукі і прымуць больш рашучыя меры».

Ва ўсім япона-манчжурскім друку Харбіна прадаўжаецца гнуснейшая кампанія за далейшыя арышты сярод совецкіх служачых КУЧ, прычым усё часцей раздаюцца заклікі к арыштам сярод адказных работнікаў упраўлення дарогі.

СТАЧКА ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ РАЗРАСТАЕЦЦА

НЬЮ-ЮРК, 9 верасня. (БЕЛТА). Стачка тэкстыльшчыкаў разрастаецца. Прадаўжаюць працаваць толькі дробныя прадпрыемствы ў аддаленых раёнах. У штаце Паўднёвая Караліна з 152 фабрык закрыта 90. У штаце Паўночная Караліна закрыта 232 прадпрыемствы і часткова працуе 105. У раёне горада Гастонія, які з'яўляецца буйнейшым цэнтрам тэкстыльнай прамысловасці Поўдня, спыніла работу 101 прадпрыемства. У штаце Паўднёвая Караліна адбылося пахаванне 6 стачачнікаў, забітых паліцыяй. У пахаванні ўдзельнічала 10 тыс. бастуючых і спачуваючых ім рабочых. Міліцыя прыбыла на пахаванне за некалькі сот міль.

ГЕРМАНСКАЯ ГАЗЕТА АБ ПАХОДЗЕ „ЛИТКЕ"

БЕРЛІН, 9 верасня. (БЕЛТА). «Дэр таг», паведамляючы аб плаванні «Литке», заяўляе, што праведзены ім рэйд мае каласальнейшае сусветнае значэнне. Газета дае гэта паведамленне пад загалоўкамі: «Труднейшая задача арктычнага плавання вырашана», «Ледавіты акіян пераможан з усходу на захад».

Каментуючы дасягненні «Литке», «Дэр таг» заяўляе: «Упершыню ў гісторыі арктычнага плавання ўдалося прайсці Паўночны морскі шлях з усхода на захад». Газета напамінае, што на працягу стагоддзяў асваенне Паўночнага морскага шляху было марай мараплаўцаў. Няўдачна закончыліся ўсе спробы спецыяльных экспедыцый прайсці гэты шлях з захада на ўсход, зробленыя, пачынаючы з XVII века і да 1932 г. Толькі совецкаму ледаколу «Сібіряков» удалося прайсці гэты шлях. Аднак, пры завяршэнні шляху ледакол сустрэў найвялікшыя труднасці. «Тым большае значэнне,—заключае газета,—мае той факт, што «Литке» ўдалося прайсці паўночны морскі шлях з усходу на захад».

АПОШНІЯ ДАНЫЯ АБ ПАЖАРЫ НА АМЕРЫКАНСКІМ ПАРАХОДЗЕ

ЛОНДАН, 8 верасня. Варочаючыся ў Амерыку, загараўся амерыканскі параход «Морро Кестл» водазмяшчэннем у 11.600 тон.

НЬЮ-ЙОРК, 9 верасня. (БЕЛТА). Згодна апошніх даных пры пажары на параходзе «Морро Кестл» загінула 225 чалавек і выратавалася 333. Прычына пажара не ўстаноўлена. Першапачатковае паведамленне аб тым, што пажар выбухнуў ад малан кі, не пацвердзілася. Пажар на параходзе пачаўся за 6 міль ад берага раніцой, калі ўсе пасажыры спалі. Агонь хутка ахапіў усё судно і таму ўдалося спусціць толькі некалькі лодак. Большасць пасажыраў і маракоў кідаліся з борта ў мора. Некалькім пасажырам удалося, дзякуючы выратоўчым паясам, даплыць да берага.

ПА СССР

ТАВ. КАГАНОВІЧ У ОДЭСЕ

МАСКВА, 10 верасня. («Інфармацыя «Правды»). У Одэсу прыехаў сакратар ЦК ВКП(б) т. Кагановіч. 9 верасня т. Кагановіч прымаў удзел у работах пленума горсовета, прысвечанага пытанням комунальнага і жыллёвага будаўніцтва.

КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ АПРАЦОУКУ ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ

МАСКВА, 10 верасня. (БЕЛТА). Наркамзем СССР сумесна з Наркамлегпромам СССР арганізуе ўсесаюзны конкурс вобласцей, МТС і калгасаў на лепшую незавадскую первічную апрацоўку ільну і канапель.

Створан прэміяльны фонд у 600 тыс. руб. Устаноўлены чатыры прэміі—у 200 тыс., у 150 тыс., 100 тыс. і 75 тыс. руб. 75 тыс. руб. вылучана на прэміраванне вызначыўшыхся на конкурсе работнікаў ільно-канапляводнай сістэмы.

ЗАСЕЯНА 20.027 ТЫС. ГА АЗІМЫХ

МАСКВА, 10 верасня (БЕЛТА). Паводле даных, на 5-е верасня па Саюзу засеяна азімымі 20.027 тыс. га—53 процанты плана, у тым ліку калгасы засеялі 16.613 тыс. га—57 проц. плана, соўгасы—903 тыс. га—27 проц. і аднаасобнікі—2.511 тыс. га—47 проц.

ВЕЛІКАЯ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ ДА СОВЕЦКАГА САЮЗА

НЕБЫВАЛЫ ПРЫТОК ЗАМЕЖНЫХ ТУРЫСТАЎ

ЛЕНІНГРАД, 9 верасня (БЕЛТА). У сувязі з небывалым прытокам замежных турыстаў у гэтым годзе сезон турызма, які меркавалася закрыць у верасні, прадоўжан да сярэдзіны кастрычніка. «Інтурыст» атрымаў вялікую колькасць новых буйных заявак ад экскурсійных таварыстваў Амерыкі і Еўропы. Папярэдні запіс інтурыстаў на экскурсіі ў СССР у дні окцябрскіх святкаванняў перавысіў усе чаканні. Напрыклад, у Лондан замест меркаванага аднаго намечана паслаць 3 цеплаходы.

Прадстаўнікі замежных бюро падарожжаў у сваіх заяўках падкрэсліваюць велізарную цікавасць да дасягненняў Совецкага Саюза, выкліканую расказамі турыстаў, пабываўшых у СССР у пачатку сезона.

СТАРШЫНІ СНК БССР—т. ГАЛАДЗЕДУ

Чырвонаармейская канферэнцыя байцоў-пераменнікаў №-й стралковай дывізіі вам, і ў вашай асобе ўраду БССР, шле гарачае чырвонаармейскае прывітанне.

Канферэнцыя ад імя байцоў і начскладу дывізіі запэўняе вас і ў вашай асобе пролетарыяту і працоўных Совецкай Беларусі, што пастаўленыя перад дывізіяй задачы па баявой і палітычнай падрыхтоўцы мы будзем выконваць з той-жа ўпартасцю і настойлівасцю, якую праявілі ў справе выканання гаспадарча-палітычных задач у другім годзе другой пяцігодкі.

ПРЭЗІДЫУМ КАНФЕРЭНЦЫІ.

Аб ходзе дровалесазагатовак і вывазкі

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР

Совет Народных Камісараў БССР адзначае зусім недапушчальнае аслабленне тэмпаў загатоўкі дроў, в таксама вывазкі дроў і лесаматэрыялаў. За жнівень месяц загатоўлена дроў 38.500 раўметраў, вывезена дроў 31.600 раўметраў і вывезена лесаматэрыялаў 44.500 куб. метраў. Улічваючы заданне II і III кварталаў, на верасень месяц астаецца загатовіць дроў 467.600 раўметраў, вывезці дроў 378.700 раўметраў і вывезці лесаматэрыялаў 77.500 куб. метраў.

Аслабленне тэмпаў па загатоўцы і вывазцы тлумачыцца галоўным чынам супакаеннем здаваньняючым выкананнем плана II квартала і дапушчэннем самацёку ў рабоце III квартала. Асабліва гэта з'явішча наглядаецца ў Рагачоўскім, Быхаўскім, Клічаўскім, Нараўлянскім і Чачэрскім раёнах.

У мэтах поўнага і своечасовага забеспячэння пролетарскіх цэнтраў апалам, прамысловасці і транспарта будматэрыяламі і апалам, Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць старшынь РВК, дырэктароў леспрамгасаў і пестрангасаў у пяцідзённы тэрмін разгарнуць дровалесазагатоўку і вывазку такімі тэмпамі, якія забяспечылі б да 1 кастрычніка поўнае выкананне і перавыкананне заданняў II і III кварталаў.

2. Улічваючы асаблівую важнасць задачы па забеспячэнню гарадоў і прамысловасці дровамі і лесам прапанаваць старшыням РВК і дырэктарам ЛПГ (ЛТГ) тых раёнаў, якія ўжо выканалі заданне II і III кварталаў, адшукаць усе магчымасці для далейшага прадаўжэння работ па дровалесазагатоўках і вывазцы.

3. Прапанаваць упаўнаркомлеса, трэсту Лесбел (т. Шапіра) узяць пад асабісты кантроль адстаючыя раёны і ЛПГ і канкрэтным, аператыўным кіраўніцтвам аказаць ім адпаведную дапамогу па выкананню плана дровалесавывазкі.

Аб ходзе работ інфармаваць СНК кожныя 10 дзён.

4. На бліжэйшым пасяджэнні СНК заслухаць даклады некаторых РВК, ЛПГ і ЛТГ аб становішчы выканання плана дровалесазагатовак і вывазкі. Пералік РВК, ЛПГ і ЛТГ, падлягаючых заслуханню, павінен быць прадстаўлен упаўнаркомлесам.

Нам. старшыні Совета Народных камісараў БССР М. ГАЛЕНДО.

Нам. кіраўніка спраў Совета Народных Камісараў БССР І. ПЯТРОВІЧ.

ЗА ШЫЛЬДАЙ СЯРЭДНІХ ЛІЧБАЎ

(Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

Апошняя зводка аб ходзе хлебапаставак па Пухавіцкаму раёну стракаціць такімі лічбамі. План хлебапаставак па калгасах выканан на 100,3 проц.

Па асобных калгасах мы маем яшчэ больш адзіўляючыя паказальнікі. Калгас імя Фрунзе, Галацкага сельсовета, хлебапастаўкі выканаў на 154 проц. З калгаса незаконна ўзята 77 цэнтнераў зярна. Калгас «Чырвоная ніва», Туранскага сельсовета, выканаў план на 141 проц., або ўзята лішняга зярна 9 цэнтн. «Новы спічнік»—125,6 проц., або ўзяты лішнія 24 цэнтн. З калгаса «Новы лучок» узята лішняга зярна 15 цэнтн., «Чырвоны правадыр» — 10 цэнтн., «Сілач»—33 цэнтн. і т. д. Такім чынам звыш уручаных абавязацельстваў узята хлеба больш чым з 50 калгасаў. Гэтыя лішкі складаюць па грубых падліках 410 цэнтн. у той час, калі большасць калгасаў далёка не выканалі сваіх абавязацельстваў, а асобныя калгасы выканалі планы хлебапаставак на 50-60 проц.

Чым-жа тлумачаць такое становішча з хлебапастаўкамі ў Пухавіцкім райкоме і камітэце загатовак. Там распаўсюджваюць такое перавыкананне абавязацельстваў тым, што калгасам, якія маюць фермы, былі вельмі позна прадастаўлены ільготы. Да прадастаўлення ільгот калгасы поўнасцю выканалі свае абавязацельствы. А цяпер з абавязацельстваў занялі ільготы. Таму атрымліваецца такое перавыкананне.

Звернемся да фактаў. Адносіну аб прадастаўленні ільгот калгасам, камітэт загатовак спусціў яшчэ 10 жніўня. На 10 жніўня план калгасамі быў выкананы толькі на 27 проц., а на 15 жніўня—на 59,5 проц. Да атрымання ільгот выканалі поўнасцю пастаўкі 2-3 калгасы. Ужо з гэтага відаць, што сцвярджэнні раённых кіраўнікоў нічым не абгрунтаваны. Калі мы нават дапусцім, што па прычыне дрэннай работы пошты гэтыя паведамленні аб ільготах далёкія калгасы атрымалі праз 15 дзён (чаго, зразумела, быць не магло)—25 жніўня—то ўстае пытанне: чаму ў апошнюю пяцідзённку жніўня прымалі лішняе зярно ад калгасаў. Так, калгас імя ЦК КП(б)Б у апошнюю пяцідзённку здаваў 22 цэнтн.; узята 6 цэнт. лішніх. З калгаса «Трактарыст» (план быў выканан поўнасцю) ўзята дадаткова 15 цэнтн. Калгас імя Ільіча выканаў план на 25 проц., а з яго ўзята яшчэ 16 цэнтн. І так з 22 калгасаў, якія выканалі хлебапастаўкі поўнасцю, у апошнюю пяцідзённку прымалі хлеб на 5-10-15 цэнтн. звыш абавязацельстваў.

Аказваецца, што своечасовыя сустрэчныя планы калгасам у Пухавічах складаліся так. Старшыні сельсоветаў і ўпаўнаважаныя райкома, кіруючыся строгім указаннем раённых арганізацый, не глядзелі на тое, што асобныя калгасы выканалі планы і прымушалі іх везці хлеб, а на складах яго прымалі.

Раённыя арганізацыі не лічаць патрэбным змагацца за тое, каб кожны калгас, кожная аднаасобная гаспадарка выканала свае абавязацельства перад дзяржавай. Ім важна толькі, каб сярэдняя раённая лічба была прыемнай.

Што ім да таго, што аднаасобны сектар ганебна адстае, што ім да таго, што па Гарэліцкаму сельсовету аднаасобнікі выканалі план толькі на 41 проц., што больш 30 гаспадарак гэтага сельсовета не здалі дзяржаве ні аднаго кілограма збожжа, у той час, як з калгасаў гэтага сельсовета ўзята лішніх 26 цэнтнераў?

Вл. МАЧАЛЬСКІ.

Адкрыўся начны прафілакторый для рабочых завода імя Варашылава і «Большевік» (Менск). На здымку: пакой начнічку.

АРГАНІЗАВАЦЬ УБОРКУ БУЛЬБЫ

МАГІЛЕЎ. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

У раёне пачалася масавая ўборка бульбы. Перадавыя калгасы «Новы свет», «Чырвоная іскра» выканалі гадавы план бульбапаставак.

У большасці калгасаў няма рабочых планаў на ўборку бульбы. Калгас «Першае мая», Добраснівіцкага сельсовета, першым выканаў 2 гектары бульбы і размеркаваў на працадзень пароўну.

Інакш абстаіць у перадавых калгасах. У калгасе «Ударнік» брыгадзір Пелікаў арганізаваў работу так: 30 калгаснікаў разбіты на 2 групы, да кожнай групы прымацаваны параконны плуг. 15 калгаснікаў расстаўляюцца ў адной баразне, якая надзелена на 15 участкаў, па ліку калгаснікаў. Вечарам брыгадзір вымярае шырыню ўборанага ўчастка і адразу вызначае выпрацоўку кожнай калгаснікі, выходзячы з нормы 15 чал. на гектар. Калгаснікам даецца права браць сабе некалькі больш або меншую долю ў баразне, у залежнасці ад спрактыкаванасці.

У калгасе «Чырвоны сармавец» калгаснікі разбіты на звенні. Кожнаму звяну даведзена поўная колькасць баразён, а ўжо ўжыне баразны надзелены між калгаснікамі. Недахоп гэтага спосабу ў тым, што дрэнна скарыстоўваецца плуг, і выварочанне бульбы ідзе праз баразну.

Дрэнна, што ніводзе ў адзіную ўліку працы не пакладзена колькасць выкананай бульбы. Нават у перадавых калгасах бульба не сартуецца.

Трэба звярнуць увагу на тое, што сартаванне павінна быць не толькі па велічыні, але па гатункам, бо змяшэнне гатункаў дае неадначасовае саграванне і прыводзіць да псавання бульбы ў буртах. Улічваючы ўсё гэта, палітаддзел МТС выпусціў з удзелам агранома спецыяльную лістоўку, прысвечаную пытанням арганізацыі працы, уборкі і захаванасці бульбы дзяржаве, прапрацаваўшы гэта пытанне на нарадзе партыйных арганізатараў зоны МТС. Шырока вывучаецца і папуляризуецца вопыт перадавых калгасаў па арганізацыі працы на бульбаўборцы.

В. ДАЛЬ.

ПАПРАЎКА.

Даклад т. Цвярніка на IV пленуме ВЦСПС аб перабудове работы профсаюзаў, які змешчан ва ўчарашнім нумары «Звязды», дан у скарочаным выглядзе.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

13 верасня 1934 г. у 7 гадзін вечара пры юрэ скаргаў упаўнаважанага Камісіі Совецкага Кантроля (Дом урада) склікаецца НАРАДА АКТЫВА КСК. Тэма абавязкова.

Нам. упаўнаважанага КСК пры СНК СССР па БССР М. М. КАМКЕНЕР.

МЕНСК

★ ФІНАЛЬНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ БВА па ўсіх відах спорту адбудуцца сёння і 12 верасня на стадыёне «Дынамо». У спаборніцтвах прымаюць удзел лепшыя майстры БВА і БССР. Пачатак спаборніцтваў 11 верасня ў 16 гадзін і 12 верасня ў 12 гадзін. Уваход вольны.

★ ВАЕННЫ ГУРТОК АСО арганізуюць ЦС Асавіяхіма сумесна з комсамолам на менскім дапрызыўным пункце Дома селяніна. Апрача розных наглядных дапаможнікаў, будуць выстаўлены вучэбныя планеры. Для правядзення масавай работы ЦС Асавіяхіма вылучае двух інструктароў.

★ ЧЫРВОНЫ БОЗ З БУЛЬБАЙ І ГАРОДНІНАЙ арганізавалі ўчора калгаснікі і аднаасобнікі Менскага раёна ў гонар Чырвонай арміі. Дастаўлены сотні тон бульбы і гародніны.

★ ПЕРШЫ ТОМ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ здан у друк Інстытутам літаратуры і мастацтва Акадэміі Навук Беларусі. Том прысвечан разгляду творчасці беларускіх пісьменнікаў дакастрычніцкага перыяда.

★ ПА ДЗВЕ З ПАЛОВАЙ ТОНЫ БУЛЬБЫ, БУРАКОЎ І БРУЧКІ атрымалі ад сваіх індывідуальных гародаў рабочыя Менскай МТС. Апрача гэтага рабочым будуць выданы бульба і гародніна з дэцентралізаваных варатовак.

...е марксіст... займае слу... ...му, каго мы ... для гэтага школу, гур... ...ага падрых... ...казаць, што ...ы няўмелы ...часта пры... ...гуртка, да ...ву прапра... ...антання на ...даб папяро... ...даў таварыш... ...школ. Пра... ...ць характар ...ина быць у ...адрыхтоўкі і ...ымаемага ў ...партыйнай ...лы. Праверць і ў сярэ... ...мем вучобу ...ка кожнай праз мастацкую літаратуру вывучаць нашу сапраўднасць. Наша мастацкая літаратура павінна стаць неадлучнай часткай усёй нашай работы па марксісцка-ленінскаму выхаванню. Трэба чытаць мастацкія творы, дасканала іх прадумваць і прапрацоўваць.

Узяць беларускую совецкую літаратуру. Яна мае такія творы, як «Дрыгва» Коласа, «На чырвоных пядах» Лынькова, «Тэорыя Капенбрун» Самуйленка, «Шчаслівая дарога» Александровіча, «Бацькаўшчына» Кузьмы Чорнага», «Язэп Крушынскі» Бядулі, «Так пачыналася маладосць» Броўкі і інш.

Вось гэтыя названыя творы, калі вы іх уважліва прачытаеце, пачынаючы з «Дрыгвы» Коласа, якая дае яркія ўзоры класавай барацьбы на Палессі, калі вы прачытаеце Лынькова, які паказвае дарэвалюцыйную барацьбу, рост і расстаноўку класавых сіл у дарэвалюцыйнай Беларусі і т. д., калі вы возьмеце «Над ракой Арэсай» Купалітычную ... васць да мастацкай ... выкі рэгулярнага ч... прывіваць прапаганд... хачам. Мастацкая л... на паслужыць фур'... вым сродкам фарма... стычнага светапогляд...

Я канчаю, таварыш... насцю, што калі вы ... большэвіцку возьмеце ... сісцка-ленінскую вуч... ...ўчастак работы мы ... кую вышыню, на як... быць. Гэта адна з ... комсамольцы і комсам... стойнымі сынамі і ... маткі — Усесаюзнай ... Партыі» (Сталін).

Вышэй марксісцка-... чобу ў комсамоле! (Б... дысменты).

...га судзіўся ...божжа.

...цова —Са... ...рахункавод. ...мсцячы за ...рахункавод... ...ліп і за гэ... ...аваў ад кла... ...да жыта на ...ст. з ра... гасе «Чырвоны дуб»? Ёсць. Ці пісаў ён гэты матэрыял? Не, не пісаў. Ён ад гэтага адмаўляецца, дый мы самі ўстанавілі, што аўтар пісьма не Трыфаненка, а нехта другі. Друкуем тэкст выданай нам даведкі.

«ДАВЕДКА

Матэрыял пад загалоўкам «Група школнікаў павінна ...буў рахункаводам ка... ...знят за дрэнную работу... Як відаць з усяго ... Зайцаў — сынок 3-3... ...ці з бацькай Лукаш... праз друк зводзіць а... хункі, падпісваючы ... вішчам заметку, ён ... маўся падробкай подп...

Менск, друкарня «Звязды». Выпускаючы — С. БУТОМАЎ, ст. Карэктар — БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж — ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпер — Е. КАГАН, ст. друкар — З. РУБІН. Ул. Гапоўнітбела № К—3218.

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ—1)
Маст. кір. засл. арт. расп. Л. М. ЛІТВІНАЎ
СЕННЯ К. Ірапіды
КАНЕЦ ДРУЖБЫ
драма ў 4 дзеях.
Пачатак ў 8 гадзін вечара.

Гукавы кіно-тэатр „Чырвоная Зорка". Гукавы мастацкі фільм КАР'ЕРА РУДЗІ На летняй эстрадзе—канцэрт
Гукавы кіно-тэатр „Пралетарый". Амерыканскі гукавы фільм Здрадніцтва Марвіна Блейка. У фай'е—КАНЦЭРТ.
Кіно „Інтэрнацыянал". Мастацкі фільм АМОК (Закон Інбавзен)
Кіно „СПАРТАК" Нашумелы кіно-фільм СПАРТАК Драма ў 7 частках

Менскі садова-гародны тэхнікум аб'яўляе НАБОР студэнтаў на 1-ы курс.
Прыём заяў да 1-X—1934 г.
Іспыты 1, 2, 3 кастрычніка.
Заняткі пачнуцца 5. X. 34г.
Асвета для паступаючых патрэбна ў аб'ёме не ніжэй 7-мігодкі.
Студэнты забяспечваюцца інтэрнатам, сталоўкай і стыпендыяй.
Адрас: Менск, Лошыца 1-ая.
Дырэкцыя.

Менскі садова-гародны тэхнікум аб'яўляе КОНКУРС на замяшчэнне вольных пасад па наступных дысцыплінах:
1. Матэматыка 1
2. Фізіка 1
3. Палітэканомія і эканомпалітыка 1
4. Беларуская літаратура 1
5. Расійская мова і літаратура 1
6. Замежная мова (нямецкая) 1
7. Біалогія з асновамі заалогіі 1
8. Батаніка 1
9. Чарчэнне 1
10. Хімія 1
Тэхнікум знаходзіцца ў Лошыцы на Заходняй плодаягадняй станцыі. Квартэрай з комунальнымі ўслугамі тэхнікум забяспечвае.
Аплата за згодзе.
Адрас: Менск, Лошыца 1-ая.
Дырэкцыя

На падставе пастановы ўрада СССР ад 25 VIII—34 г. і загада наркома земляробства БССР ад 5-IX—34 г. за № 883
САДОВА-ГАРОДНЫ ІНСТЫТУТ рэарганізуецца ў садова-гародны тэхнікум.
Студэнты інстытута II, III, IV курсаў і прынятыя на 1 курс павінны з'явіцца на заняткі ў Беларускі сельскагаспадарчы інстытут у Горкі к 1-X—34 г.
Начальнік аддзела кадраў НКЗБ ДАСЫ.
Дырэктар Інстытута ЛАГУЦЕНКА.

БЮРО ІНВЕНТАРЫЗАЦЫІ жыл.-арэнд.-зямельн. кіраўніцтва Менгорсовета
даводзіць да ведама ўсіх установаў, арганізацый, якія карыстаюцца комунальнай маемасцю або маюць свае ўласныя будынкі,
а таксама прыватных домаўласнікаў, што на аснове абавязковай пастановы Менгорсовета ад 1. IV. 34 г. (аб рэгістрацыі бягучых змен у складзе палажэння і кошту маёмасці дзяржаўных і прыватных домаўладанняў у г. Менску)
бюро інвентарызацыі прапануе усім ведамственным асобам, якія праводзілі ў 1933-34 г. дабудовы, прыбудовы і перапланіроўкі ў сваіх уладаннях, а таксама зямельных участках,
у 10-дзённы тэрмін падаць гарадскому інжынеру жыл.-арэнд.-зямельн. кіраўніцтва у 2-х экз. ПЛАНЫ ЗМЕН.
У выпадку невыканання вышэй указанага на вінаватых будзе накладзен штраф згодна абавязковай пастановы Менгорсовета.
Бюро інвентарызацыі.

ВЫШЛІ з ДРУКУ
„ЗАПІСКІ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК"
№ 3 № 3
ЗМЕСТ
Праф. Ф. Я. БАХЦЕЕЎ—Значэнне торфу ў народнай гаспадарцы БССР.
Праф. В. С. ДАКТУРОЎСКІ—Міжледніковыя торфы БССР.
Акад. Ц. БУРСТЫН—Аб тэорыі агрэгатаў Пфафа.
Акад. В. К. Шчарбакоў—Паўстанне сялянства ў Крычаўскім старостве.
Акад. М. М. КУЛАГІН—Дзеянне вільгаці на развіццё насекомых.
Е. Б. ЮРКОЎ—Вывучэнне прышчэпак у бульбы.
І. З. СУРТА і І. П. БРЫХНІЧОЎ—Натуральна-гістарычны матэрыялізм (маніям) у святле марксізма-ленінізма.
Праф. С. М. ГОФМАН—Пытанні судовай дзейнасці і навукова-даследчая работа ў вобласці права.
Г. ЛЕВІН—Ленінская тэорыя адлюстравання.
БІБЛІЯГРАФІЯ.
ХРОНІКА.
Беларускі дзяржаўны садова-гародны інстытут, згодна загада Наркамземляробства БССР рэарганізуецца в 5-га верасня 1934 г. у садова-гародны тэхнікум.
Установы, прадпрыемствы і арганізацыі г. Менска, якія маюць прэтэнзіі да інстытута павінны заявіць аб іх да 20-X. 34г. па адрасу: г. Менск, Лошыца 1-ая, пошт. скрынка, 31, Ліквідком.
Пасля ўказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца НЕ БУДУЦЬ.
Ліквідком.

НКасветы, ЦСПСБ, ПАЛІТСЕКТАР НКЗБ, ЦК ЛКСМБ аб'яўляюць УСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС НА П'ЕСУ «МАЛОЙ ФОРМЫ» ДЛЯ ГАРАДСКОЙ І КАЛГАСНАЙ КЛУБНАЙ СЦЭНЫ.
1. ТЭМАТЫКА П'ЕСЫ:
Наша соцыялістычнае будаўніцтва ў горадзе і вёсцы:
а) ПА ПРАМЫСЛОВАСЦІ: 1. Аўладанне тэхнікай, 2. Жыццё рабочых, 3. Жанчыны на выторчасці, 4. Рабочая моладзь.
б) ПА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ: 1. Аб перавыхаванні калгаснікаў, 2. Вялікая сіла (аб жанчыне-калгаснічцы), 3. Калгасная моладзь, 4. Заўтрашні калгаснік.
2. УМОВЫ КОНКУРСА:
а) У конкурс прымаюць удзел калектывы і адзіночкі пісьменнікаў, рабочых і калгаснікаў, работнікаў тэатра, драмгурткоў і інш.
б) П'еса павінна быць высока-мастацкай і палітычна-вытрыманай, арыгінальнай для выканання на клубнай сцэне-пляцоўцы, неграмоздкай з дзюжымі асобамі;
в) П'еса павінна быць напісана на мове нацыянальнасцей, насяляючых БССР (беларуская, яўрэйская, польская, руская, літоўская і інш.);
г) За першую п'есу ўстанавіць наступныя прэміі:
1-ая прэмія — 1—3.000 руб.
2-ая прэмія — 2—2.000 руб.
3-ая прэмія — 3—1.000 руб.
3. Склад для кіраўніцтва конкурсам журы: тт. Дунец (старшыня), Клікевіч (СПБ), Гурчанка (Культпроп ЦК КП(б)Б), Зніч (Палітсектар НКЗБ), Культпроп ЦК ЛКСМБ, Рубінштэйн (ЦОПОБ), Дольнікаў (НКА).
4. Апошні тэрмін здачы п'ес — 15 снежня 1934 г.
5. Твары, якія ўключаюцца ў конкурс, павінны ўсесь матэрыял дасылаць па адрасу: г. Менск, Дом урада, НКАсветы, кіраўніцтва мастацтваў. Журы конкурса.

Нам. адк. рэдактара А. ДЖЭЛЮК.